Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

17 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 114 (28224) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




Патрабуйце
чэк
у таксіста

СТАР. 2



Затопленыя
карціны

СТАР. 12



Праграма
тэлебачання
на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

*Праект*

## АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ на 2016—2020 гады,
### якая будзе прынята пасля шырокага грамадскага абмеркавання на пятым Усебеларускім народным сходзе

### ВЫНІКІ ПЯЦІГОДКІ. НАШЫ ДАСЯГНЕННІ

Галоўны вынік чацвёртай пяцігодкі (2011—2015 гады) — захаванне палітычнай стабільнасці, устойлівасці эканомікі і сацыяльнай абароны насельніцтва.

Нягледзячы на крызіс, які ўзнік у краінах-суседках, мы не толькі прадухілілі абвал, але і забяспечылі станоўчы рост эканомікі за пяцігоддзе. Больш за тое, па шэрагу напрамкаў нам удалося дамагчыся значных вынікаў.

**Беларусь увайшла ў ТОП-50 краін свету з высокім узроўнем чалавечага развіцця.**

Згодна з Дакладам ПРААН аб чалавечым развіцці Рэспубліка Беларусь па індэксе чалавечага развіцця сярод 188 краін свету перамясцілася з 68-га месца ў 2000 годзе на 50-е месца ў 2015 годзе.

**Валавы ўнутраны прадукт** на душу насельніцтва па парытэце пакупніцкай здольнасці вырас з 15,4 тыс. долараў ЗША ў 2010 годзе да 17,7 тыс. долараў ЗША ў 2015 годзе.

**Павысіліся памеры сацыяльных гарантый і даходаў насельніцтва,** што дазволіла знізіць долю малазабяспечанага насельніцтва з 7,3 працэнта ў 2011 годзе да 5,1 працэнта ў 2015 годзе.

**Істотна палепшылася дэмаграфія.** З 2014 года ўпершыню за дваццаць гадоў колькасць жыхароў у Беларусі пачала расці, сціснуліся дэмаграфічныя нажніцы.

У 2015 годзе нарадзілася 119 тыс. дзяцей, што на 494 дзіцяці больш, чым у 2014 годзе. Больш за палову народжаных дзяцей (57,2 працэнта) — гэта другія, трэція і наступныя дзеці ў сем'ях.

**На сусветны ўзровень выйшла айчынная медыцына** па ўсіх без выключэння напрамках: кардыялогія, анкалогія, траўматалогія, нейрахірургія, акушэрства і гінекалогія, педыятрыя і транспланталогія.

Нашых урачоў цэняць па ўсім свеце. Экспарт паслуг у галіне аховы здароўя сёння ажыццяўляецца ў 124 краіны свету.

**Прадоўжылася масавае будаўніцтва даступнага жылля.** Забяспечанасць насельніцтва жыллём вырасла з 24,6 кв. метра ў 2010 годзе да 26,5 кв. метра на аднаго чалавека ў 2015 годзе.

**Праведзена маштабная мадэрнізацыя прамысловасці і сельскай гаспадаркі,** куды ўкладзена больш за 40 мільярдаў долараў.

Цалкам абноўлена галіна дрэваапрацоўкі. Асвоена серыйная зборачная вытворчасць легкавых аўтамабіляў. Выраблены самы буйны ў свеце кар'ерны самазвал грузападымальнасцю 450 тон. Пабудаваны завод па вытворчасці сучасных чыгуначных электрацягнікоў. Пачата будаўніцтва Беларускай АЭС.

СТАР. 3

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Павел КАЛАУР, старшыня праўлення Нацыянальнага банка:**
*«Макраэканамічныя ўмовы для правядзення дэнамінацыі прымальныя. Мы ў стане забяспечыць да канца года разам з урадам мэтавы ўзровень па інфляцыі — гэта не больш за 12%. На наступны год плануем адназначную лічбу па інфляцыі — не больш за 9%. І ў праграме да 2020 года прагноз прадугледжвае ўзровень інфляцыі не больш за 5%. Такія дзеянні ўрада і Нацыянальнага банка будуць падтрымліваць пакупніцкую здольнасць нацыянальнай валюты, павялічваць да яе давер».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20028,00 | ▼ |
| Еўра | 22569,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 304,10 | ▲ |
| Укр. грыўня | 804,82 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# РАЗАМ — ЗА МОЦНУЮ І КВІТНЕЮЧУЮ БЕЛАРУСЬ!



Наталля КУЛЬЦЕНКА 17 гадоў узначальвае дзіцячы дом горада Віцебска. Яна — лаўрэат званняў «Чалавек года Віцебшчыны-2014» і «Жанчына года Беларусі-2014». На V Усебеларускім народным сходзе Наталля Уладзіміраўна будзе прадстаўляць родны горад. На гэтым здымку яна разам са сваімі выхаванцамі.

Фота БЕЛТА.

# ПА-ДЗЯРЖАЎНАМУ, НА ПЕРСПЕКТЫВУ

## Банкаўская сістэма павінна спрыяць эфектыўнай рабоце эканомікі

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў час рабочай сустрэчы з прэм'ер-міністрам Андрэем Кабяковым і старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Паўлам Калаурам.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ён у апошні час спецыяльна не ўмешваецца ў пытанні развіцця банкаўскай сістэмы, валютнага рынку і грашова-крэдытнай сферы. Разам з тым ён падкрэсліў, што галоўнае — не спыніцца і не застопарыць працу эканомікі.

Адной з галоўных тэм сустрэчы таксама стала маючая адбыцца ў Беларусі дэнамінацыя, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. «Я атрымліваю інфармацыю пра тое, што Нацбанк і ўрад правялі значную работу, каб спакойна перайсці на новую валюту. Народ гэтага чакае. Гэта датычыцца кожнага, — сказаў Прэзідэнт. — Таму сур'ёзны момант, і палітычны. Трэба, каб гэта добра было арганізавана».

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што дэнамінацыя, якая, магчыма, у нейкай ступені з'яўляецца непапулярным мерапрыемствам, праводзіцца напярэдадні палітычнай кампаніі — парламенцкіх выбараў. «Гэта сведчыць аб тым, што мы нікога не баімся, мы — дзяржаўныя людзі, а не толькі нейкія там палітыкі. А дзяржаўныя людзі заўсёды думаюць пра перспектывы, развіццё дзяржавы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У пачатку сустрэчы Прэзідэнт таксама паведаміў аб новым дасягненні беларускага ваенна-прамысловага комплексу. «У нас сёння шчаслівы дзень у плане бяспекі і абароны. Нашым вайскоўцам за тыя мізэрныя грошы, якія ім далі, удалося распрацаваць і выпрабаваць ужо сёння створанае ў Беларусі ракетнае ўзбраенне. Ажыццёўлены пуск ракетных комплексаў. Выпрабаванні прайшлі вельмі паспяхова. Гэта ракетныя комплексы, якія створаны ў нас у Беларусі на працягу двух гадоў», — расказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка даручыў Андрэю Кабякову разгледзець пытанне аб прадстаўленні да дзяржаўных узнагарод тых, хто ўнёс свой уклад у стварэнне адпаведнага ўзбраення. «Прытым без усялякіх абмежаванняў. Хто заслужыў, павінны атрымаць гэтыя ўзнагароды. Гэта найвялікшае дасягненне», — дадаў Прэзідэнт.

# ДА ВЫКАНАННЯ ЗАДАЧ ГАТОВЫЯ

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра ўнутраных спраў Ігара Шуневіча

На сустрэчы абмяркоўвалася падрыхтоўка органаў унутраных спраў да забеспячэння правапарадку падчас правядзення V Усебеларускага народнага сходу. Як было дапожана Прэзідэнту, разлік сіл і сродкаў, якія будуць для гэтага задзейнічаныя, ужо праведзены. Міліцыя возьме пад ахову месца знаходжання дэлегатаў, зоймецца суправаджэннем транспарту, будзе працаваць у месцах правядзення мерапрыемстваў Усебеларускага сходу. Усе падраздзяленні органаў унутраных спраў да выканання гэтых задач гатовыя.

Аляксандр Лукашэнка таксама пацікавіўся, як ідзе падрыхтоўка да 100-годдзя беларускай міліцыі ў 2017 годзе, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Кіраўнік дзяржавы быў праінфармаваны аб плане падрыхтоўкі да святкавання юбілейнай даты, рэалізацыя якога была ім ухвалена.

Як старшыня назіральнага савета ХК «Дынама-Мінск», Ігар Шуневіч далажыў Прэзідэнту аб бягучай сітуацыі ў клубе. Аляксандр Лукашэнка закрануў меры, якія неабходна здзейсніць для развіцця «Дынама-Мінск», і запатрабаваў больш якаснай і выніковай гульні ў гэтым сезоне, «каб ізноў не абнясслаўцца перад беларускім народам».

Ігар Шуневіч праінфармаваў Прэзідэнта аб камплектаванні каманды «Дынама-Мінск». Клуб падрыхтаваўся да падпісання шэрагу кантрактаў, у тым ліку з легіянерамі, з хакеістамі Рэспублікі Беларусь, з трэнерскім штабам. Кіраўнік дзяржавы ў цэлым ухваліў гэтыя прапановы.

■ Выбары - 2016

# ЗАМЕЖНЫХ НАЗІРАЛЬНІКАЎ СТАНЕ БОЛЬШ

## Сёлета для маніторынгу выбараў 11 верасня будуць запрошаны і прадстаўнікі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ)

**Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу вызначыла міжпарламенцкія арганізацыі, якія будуць запрошаны для маніторынгу выбараў 11 верасня.**

Як адзначыў на пасяджэнні Савета Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу яе старшыня **Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**, на выбарах звычайна працуе вялікая колькасць міжнародных назіральнікаў. Міністэрства замежных спраў ужо прапанавала Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) АБСЕ і Выканаўчаму камітэту СНД накіраваць у Беларусь сваіх назіральнікаў. Аналагічнае запрашэнне падрыхтуе і Палата прадстаўнікоў. Паводле слоў Уладзіміра Андрэйчанкі, сёлета для назірання за гэтай падзеяй будуць запрошаны Міжпарламенцкая асамблея дзяржаў СНД, Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі, ПА АБСЕ, ПА АДКБ. Таксама плануецца запрасіць і назіральнікаў ад ПАСЕ.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў паведаміў, што іх галоўнай задачай стане «арганізацыя працы замежных назіральнікаў такім чынам, каб яны змаглі аб'ектыўна ацаніць сітуацыю ў краіне, наглядна пераканацца ў тым, што выбары ў нас праходзяць спакойна, адкрыта і дэмакратычна, у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам». Спікер таксама лічыць, што аб'ектыўнасці міжнароднай ацэнкі выбараў будзе спрыяць прынятае нядаўна Цэнтрвыбаркамам рашэнне, накіраванае на павышэнне празрыстасці выбарчага працэсу. Акрамя таго, старшыня Палаты прадстаўнікоў выказаў думку, што дэпутатам неабходна максімальна задзейнічаць кантакты з замежнымі калегамі — для пашырэння міжпарламенцкага супрацоўніцтва, выкарыстання інструментаў парламенцкай дыпламатыі і абароны нацыянальных інтарэсаў Беларусі.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# АРГАНІЗАЦЫЯМ — ЛІМІТ НА ВАДУ

## Пры перавышэнні лімітаў Мінжылкамгас прапануе браць плату за водазабеспячэнне з юрыдычных асоб у павышаным памеры

**Палата прадстаўнікоў учора прыняла шэраг законапраектаў, два з якіх разглядаліся ў першым чытанні. Адзін з новых праектаў тычыцца аўтамабільнага транспарту і аўтамабільных перавозак, а другі закранае пытанні пітнога водазабеспячэння.**

### АБ'ЯДНАЦЬ У АДЗІНУЮ СІСТЭМУ

Як растлумачыў парламентарыям **міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр ЦЕРАХАЎ**, праектам закона вызначаюцца прававыя асновы пітнога водазабеспячэння і асноўныя патрабаванні да крыніц і сістэм пітнога водазабеспячэння (санітарна-эпідэміялагічныя, прыродаахоўныя і горадабудаўнічыя).

У прыватнасці, для стымулявання развіцця сістэм абаротнага водазабеспячэння і павелічэння спажывання тэхнічнай вады ўводзіцца паняцце «ліміт водаспажывання». Праектам закона прадугледжана, што агульныя ўмовы вызначэння ліміту водаспажывання будуць вызначаца Саветам Міністраў, а правам на іх зацвярджэнне надзяляюцца мясцовыя ўлады. «У выпадку перавышэння ўстаноўленага ліміту плата за паслугу па водазабеспячэнні з юрыдычных асоб будзе брацца ў павышаным памеры, зыходзячы з аб'ёмаў фактычна ўзятай вады за кожны разліковы перыяд», — сказаў Аляксандр Церахаў.

**Новаўвядзенне дазволіць пасажырам не плаціць за паслугі таксі, калі кіроўца не дае чэка з фіксаванай сумай па таксометры.**

Паводле яго слоў, з мэтай прыцягнення пазабюджэтных крыніц фінансавання для будаўніцтва сетак водазабеспячэння ў існуючай жылой забудове ўводзіцца вузкаскіраваны тэрмін «вулічныя сеткі пітнога водазабеспячэння», які з'яўляецца элементам цэнтралізаванай сістэмы водазабеспячэння.

Разам з тым, як адзначыў міністр, наспела неабходнасць пераходзіць да адзінага далучэння абанентаў і спажыўцоў да цэнтралізаваных сістэм пітнога водазабеспячэння, а таксама рэгулявання адносін паміж абанентамі, спажыўцамі і арганізацыямі водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі. Сёння гэтыя парадак рэгламентуецца правіламі карыстання, якія зацверджаны загадам міністэрства яшчэ ў 1995 годзе. «Аднак каля 13% арганізацый, якія ажыццяўляюць водазабеспячэнне ў краіне, цяпер не адносяцца да сістэмы Мінжылкамгаса. Адпаведна, на такія арганізацыі агучаны парадак не распаўсюджваецца. Для вырашэння гэтага пытання праектам закона Савет Міністраў надзяляецца паўнамоцтвамі па вызначэнні адзіных падыходаў далучэння да цэнтралізаваных сістэм пітнога водазабеспячэння. Праект адпаведнай пастановы распрацаваны і праходзіць юрыдычную экспертызу ў Савеце Міністраў», — дадаў Аляксандр Церахаў.

### ПЛАЦІЦЬ ЗА ТАКСІ — ТОЛЬКІ ПА ЧЭКУ

Гэта новаўвядзенне, прапанаванае Мінтрансам, мае на ўвазе дазволіць пасажырам не плаціць за паслугі таксі, калі кіроўца не дае чэка з фіксаванай сумай па таксометры. Існуюць і іншыя прапановы.

Як адзначыў **міністр транспарту і камунікацый Анатоль СІВАК**, прадугледжваюцца значныя змены ў галіне перавозак пасажыраў аўтамабілямі таксі. Так, уведзена падрабязная рэгламентацыя адносін паміж



заказчыкам перавозак, аператарамі таксі, дыспетчарам і перавозчыкамі. «Артыкул 28 закона дапоўнены правам пасажыра адмовіцца ад аплаты за праезд у аўтамабілі таксі ў выпадку неатрымання ад кіроўцы чэка, які пацвярджаецца паказчыкамі таксометра», — расказаў міністр.

А вось міжнароднаму сэрвісу Uber давядзецца абавязкова зарэгістраваць юрыдычную асобу на тэрыторыі менавіта нашай краіны. Гэта дзеля таго, каб у спажыўцоў няякаснай паслугі не было сумнення, што іх не падмануць. У цэлым, паводле слоў Анатоля Сівака, дакументам прапануецца сфарміраваць празрыстую сістэму арганізацыі аўтамабільных перавозак, заснаваную на эфектыўным узаемадзеянні суб'ектаў гаспадарання і ўпаўнаважаных дзяржорганаў.

### МЯЖУ ЎЧАСТКА ЛЕПШ ФІКСАВАЦЬ

Палата прадстаўнікоў учора прыняла шэраг законапраектаў у другім чытанні. У прыватнасці, папраўкі ў Кодэкс аб зямлі больш дэталёва вызначаюць кампетэнцыю мясцовых улад у рэгуляванні зямельных адносін. Таксама дакумент прадугледжвае, што Дзяржкамітэт па маёмасці абавязаны вызначаць парадак зліцця зямельных участкаў, удакладніць парадак змены іх мяж. Прынятыя парламентарыямі змены прадугледжваюць і магчымасць канфіскацыі ўчастка пры замене забудоўшчыка і прадстаўленні гэтай зямлі новаму спажыўцу без аўкцыёну.

Таксама можна будзе забараняць змяненне мэтавага прызначэння ўчасткаў, пакуль не пройдзе восем гадоў з моманту дзяржрэгістрацыі жылых дамоў, пабудаваных на гэтай зямлі. Яшчэ адна навіна — гэта прыярытэт фіксаванай мяжы зямельнага ўчастка над нефіксаванай. Акрамя таго, калі да ўступлення ў сілу гэтых паправак члены сям'і работніка, які праходзіць альтэрнатыўную службу, атрымалі правы на службовы зямельны надзел, то правы на такую зямлю ў іх застанецца і надалей.

### ІНТЭЛЕКТУАЛЬНУЮ ЎЛАСНАСЦЬ АБАРАНЯЕМ РАЗАМ

Прагаласавалі ўчора дэпутаты і за далучэнне Беларусі да Дагавора аб патэнтавым праве. Як адзначыў першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Андрэй Касаўскі, Дагавор аб патэнтавым праве, прыняты ў Жэневе ў 2000 годзе, функцыянуе пад эгідай Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці і вызначае ўзгодненыя на міжнародным узроўні базавыя стандарты аховы правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці. Дзякуючы далучэнню да гэтага дакумента спрашчаюцца фармальныя працэдуры ў дачыненні да нацыянальных і рэгіянальных патэнтаў на вынаходкі і заявак на выдачу патэнтаў.

Акрамя таго, на пасяджэнні дэпутаты ратыфікавалі Дагавор аб каардынацыі дзеянняў па абароне правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці. Гэты дакумент рэгулюе ўзаемадзеянне ўпаўнаважаных органаў дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза паміж сабой і з Еўразійскай эканамічнай камісіяй у мэтах фарміравання адзінай сістэмы абароны правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці на тэрыторыі саюза.

### «ПРЫШЧЭПКА» АД РЭВАЛЮЦЫЙ

Таксама ў другім чытанні на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў быў зацверджаны законапраект аб Ваеннай дактрыне Рэспублікі Беларусь. Новая дактрына ўлічвае такія з'явы, як гібрыдная вайна і каляровая рэвалюцыя. Дакумент паступіў у Палату прадстаўнікоў 12 лютага 2016 гады пасля таго, як яе ўхваліў Прэзідэнт Беларусі па выніках пасяджэння Савета бяспекі. Прынясце новай дактрыны выклікана зменамі ваенна-палітычнага становішча ў свеце, характару ўзброенай барацьбы, сучаснымі тэндэнцыямі развіцця беларускай дзяржавы. У дакуменце цяпер прапісаны напрамкі развіцця абароннага сектара эканомікі.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# ПА-СУСЕДСКУ

**Рабочыя групы па міжпарламенцкім супрацоўніцтве Сейма Латвіі і Нацыянальнага сходу Беларусі сустрэліся ў Мінску. Святлана Герасімовіч, кіраўнік рабочай групы ад Беларусі і старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, адзначыла, што «наш патэнцыял далёка не задзейнічаны так, як бы хацелася».**

Перш за ўсё гаворка ідзе аб удасканаленні заканадаўчай базы. Яна дасць аснову для больш плённага развіцця па асноўных напрамках: гандаль, трансгранічнае супрацоўніцтва, турызм. Добрай пляцоўкай для абмеркавання бягучых пытанняў зарэкамендавалі сябе форумы. Так, сёлета ў Оршы прайшла трэцяя сустрэча гарадоўпабрацімаў Беларусі і Латвіі. Ужо больш за паўсотні раёнаў і гарадоў абедзвюх краін усталявалі сувязі.

Старшыня парламенцкай групы Сейма Латвіі па супрацоўніцтве з Нацыянальным сходам Артур Рубікс выказаў сваё задавальненне тым, як развіваецца ўзаемадзеянне, і адзначыў, што сёння няма набалелых пытанняў у двухбаковым партнёрстве:

— Адносіны Еўрасаюза і Беларусі пачалі вельмі інтэнсіўна развівацца ў станоўчым рэчышчы. Хоць у апошні час эканамічная сітуацыя не самая лепшая, я ўпэўнены, што крокі па супрацоўніцтве будуць яе паляпшаць.

У планах рабочай групы сустрэчы не толькі ў беларускім парламенце. Дэлегаты наведаюць прадпрыемствы «Амкадор» і «Камунарка», а таксама Мінскі абласны Савет дэпутатаў і медыцынскі цэнтр у Бараўлянах.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

*Праект*

# АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ на 2016—2020 гады

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

Уведзены ў эксплуатацыю і тэхнічна пераасначаны 1184 малочнатаварныя комплексы. Аўтаматызацыя асноўных тэхналагічных працэсаў сельскагаспадарчай вытворчасці дазволіла павялічыць прадукцыйнасць працы ў сельскай гаспадарцы прыкладна ў 1,4 раза.

Разам з Аўстраліяй, Новай Зеландыяй, Бразіліяй і Аргенцінай Беларусь уваходзіць у лік найбуйнейшых экспарцёраў малочнай прадукцыі. У нас выпрацоўваецца 1,4 працэнта сусветнага аб'ёму малака, у сусветным экспарце малочных прадуктаў доля краіны склала каля 5 працэнтаў, а па сметанковым масле — каля 11 працэнтаў.

**Беларусь узяла курс на паскораную інфарматызацыю.** У глабальным рэйтынгу Міжнароднага саюза электрасувязі па развіцці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій Беларусь паднялася з 50-га месца ў 2010 годзе на 36-е ў 2015-м, апярэдзіўшы ўсе краіны СНД.

Па экспарце камп'ютарных і інфармацыйных паслуг на душу насельніцтва Рэспубліка Беларусь таксама знаходзіцца сярод сусветных лідараў.

## ВЫНІКІ ПЯЦІГОДКІ. НАШЫ ПРАБЛЕМЫ

Беларусь — краіна з адкрытай эканомікай. Наш дабрабыт вельмі моцна залежыць ад знешніх фактараў, перш за ўсё пакупніцкай здольнасці гандлёвых партнёраў.

Крызіс у суседніх краінах, у Расіі і Украіне, на нашых традыцыйных рынках, моцна ўдарыў па Беларусі. Попыт на нашы тавары скараціўся. Канкурэнцыя рэзка вырасла. Як вынік, упалі экспарт, даходы прадпрыемстваў і бюджэту.

Гэта з'явілася адной з ключавых прычын таго, што шэраг намечаных задач не быў вырашаны.

Рост ВУП, экспарту, рэальных даходаў аказаўся значна ніжэйшым, чым запланавана. Адбылося запавольванне тэмпаў росту эканомікі.

Не ўдалося забяспечыць стабільнасць беларускага рубля, вырасла інфляцыя.

Некаторыя прадпрыемствы апынуліся ў цяжкім фінансавым становішчы. У асобных выпадках з'явілася напружанасць з выплатай заработнай платы.

Знешнія абставіны не былі адзінай прычынай эканамічных цяжкасцяў, яны толькі абвастрылі шэраг унутраных праблем нашай эканомікі.

Па-ранейшаму мы пакутуем ад нізкай прадукцыйнасці працы і высокіх выдаткаў вытворчасці.

Структура кіравання эканомікай патрабуе ўдасканалення. Кіраўніцкія тэхналогіі адстаюць ад патрабаванняў часу.

Тармозіцца ўкараненне інавацый, падаюць якасць прадукцыі і канкурэнтаздольнасць.

Нам так і не ўдалося прыцягнуць у эканоміку краіны маштабныя прамыя замежныя інвестыцыі. У аснову ставіцца крэдытаванне (гэта значыць жыццё ў доўг), а не прыцягненне прамых інвестыцый у акцыянерны капітал прадпрыемстваў.

Вырас знешні доўг краіны.

Доля малога і сярэдняга бізнесу ў Беларусі пакуль невысокая.

Акрэсленыя праблемы сур'ёзныя, але не катастрафічныя. Іх пераадоленне стане адной з ключавых задач бягучай пяцігодкі.

## ГЛАБАЛІЗАЦЫЯ: ВЫКЛІКІ І МАГЧЫМАСЦІ

У другой палове мінулага стагоддзя чалавецтва ўпершыню ў сваёй гісторыі ўступіла ў прынцыпова новую эпоху глабалізацыі.

Свет стаў узаемазалежны. З'яўленне інтэрнэту і глабальнай фінансавай сістэмы зрабіла гэтую залежнасць незваротнай.

Глабалізацыя дае кожнай краіне і кожнаму чалавеку вялізныя магчымасці. Але адначасова рэзка ўзмацняецца канкурэнцыя.

Толькі тыя краіны, якія хутчэй за іншых асвояць найлепшыя дасягненні ўсяго чалавецтва і будуць здольныя хутка змяняцца па патрабаванні часу, маюць шанц на росквіт.

Сёння свет пераходзіць ад індустрыяльнай фазы развіцця да эканомікі ведаў. Канвеерная масавая вытворчасць страчвае сваё значэнне. Традыцыйныя галіны мяняюцца знутры — на змену заводскім рабочым масава прыходзяць робаты і трохмерны друк, фінансы і гандаль пераходзяць у інтэрнэт, сплаў біяі інфармацыйных тэхналогій абяцае новую эру ў медыцыне і прадаўжэнні жыцця чалавека. Сельская гаспадарка стала высокатэхналагічнай сферай. Традыцыйная сялянская праца ў краінах з перадавой сельскай гаспадаркай замяняецца найноўшымі інфармацыйнымі і біятэхналогіямі.

Сусветная навука стаіць на парозе прынцыповых прарываў **у стварэнні штучнага інтэлекту.** Машыны вучацца мець зносіны і ўзаемадзейнічаць паміж сабой без удзелу чалавека.

Адукацыя становіцца дыстанцыйнай і бесперапыннай. Спецыялісту XXI стагоддзя прыйдзецца вучыцца ўсё жыццё.

Фундаментальныя зрухі ў развіцці цывілізацыі даюць Беларусі шанц. Мы можам хутка пабудаваць новыя галіны эканомікі. Можам ажывіць традыцыйныя сектары за кошт паскоранай інфарматызацыі і новых метадаў кіравання. Можам стаць адным з ключавых цэнтраў прыцягнення капіталу і канцэнтрацыі тэхналогій ва Усходняй Еўропе.

Але ў цывілізацыйнай развілкі ёсць і іншы шлях. Заўсёды існуе рызыка ўпасці ў стан застою з-за асцярогі перамен, якія так ці інакш непазбежныя.

Усё залежыць ад нас і ад нашага выбару.

Наш выбар на карысць энергічнага развіцця Беларусі, а не застою; на карысць адкрытасці свету, а не ізаляцыі; на карысць прагрэсу, а не стагнацыі.

## ПЯТАЯ ПЯЦІГОДКА. НАШЫ МЭТЫ І ПРЫЯРЫТЭТЫ

**Галоўная мэта** развіцця краіны на 2016 — 2020 гады — **павышэнне якасці жыцця насельніцтва** на аснове росту канкурэнтаздольнасці эканомікі, прыцягнення інвестыцый і інавацыйнага развіцця.

У 2020 годзе прырост да 2015 года складзе:

ВУП — 12-15 працэнтаў;

рэальных грашовых даходаў грамадзян — 9,5-11,6 працэнта.

Да канца 2020 года стаўкі па крэдытах знізяцца да 9-11 працэнтаў.

У кожнай беларускай сям'і будуе магчымасць пабудаваць свой дом або кватэру.

Працягласць жыцця вырасце да 75,3 года.

Для дасягнення пастаўленых мэт развіццё краіны будзе грунтавацца на наступных прыярытэтах.

**ІНВЕСТЫЦЫІ** — гэта развіццё і рост эканомікі. Гэта не толькі грошы, але і найноўшы вопыт і тэхналогіі.

**ЗАНЯТАСЦЬ** — гэта магчымасць кожнага грамадзяніна сваёй працай забяспечыць сябе і сваю сям'ю.

**ЭКСПАРТ** — аснова нашай адкрытай эканомікі, паступлення валюты ў краіну, прыбытку прадпрыемстваў, падаткаў у бюджэт.

**ІНФАРМАТЫЗАЦЫЯ** — гэта наша канкурэнтаздольнасць у сучасным свеце.

**МОЛАДЗЬ** — гэта галоўны патэнцыял дзяржавы і будучыні краіны.

## ШЛЯХІ ДАСЯГНЕННЯ. ІНСТРУМЕНТЫ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ

**1. Разняволенне дзелавой ініцыятывы**

Беларусь — краіна роўных магчымасцяў. Роля дзяржавы будзе заключацца ў стварэнні спрыяльных умоў для ініцыятывы і вядзення бізнесу як у дзяржаўным, так і прыватным сектары. Любы ініцыятыўны чалавек незалежна ад узроўню адукацыі або наяўнасці спецыяльных эканамічных ведаў зможа пачаць сваю справу ў Беларусі ці знайсці працу па душы.

Дзяржава забяспечыць абарону і недатыкальнасць правоў прыватнай уласнасці, здыме абмежавальныя бар'еры, лібералізуе кантрольную дзейнасць.

Для гэтага прадугледжваецца:

пашырэнне формаў дзяржаўнай падтрымкі суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва;

павышэнне эфектыўнасці бюджэтна-падатковай і грашова-крэдытнай палітыкі;

увядзенне адміністрацыйнай (а пры паўторным учыненні — крымінальнай) адказнасці за ўмяшанне службовых асоб праваахоўных (кантрольных, наглядных) органаў у законную дзейнасць суб'ектаў гаспадарання;

істотнае зніжэнне фінансавых санкцый за нязначныя парушэнні;

радыкальнае спрашчэнне і скарачэнне колькасці відаў і формаў справаздачнасці;

укараненне сістэмы ацэнкі наступстваў прыняцця нарматыўных прававых актаў у сферы прадпрымальніцкай дзейнасці;

скарачэнне колькасці ліцэнзаваных відаў дзейнасці;

увядзенне інстытута падатковых кансультантаў у мэтах якаснага праследавання адпаведных паслуг.

**2. Прыняцце стымулюючых мер для хуткага адкрыцця сваёй справы**

Тыя прадпрыемствы, што ствараюцца на тэрыторыі сельскай мясцовасці і гарадоў (за выключэннем Мінска і абласных цэнтраў), будуць вызваленыя на працягу двух гадоў ад падатку на прыбытак і падатку на нерухомасць.

Дзяржава ў рамках адпаведнай праграмы падтрымае пашырэнне інавацыйнай інфраструктуры малога і сярэдняга бізнесу ў рэгіёнах рэспублікі (тэхнапаркі, венчурныя арганізацыі, цэнтры падтрымкі, інкубатары малога прадпрымальніцтва).

Прадугледжваецца:

сфарміраваць пакет базавых паслуг, якія будуць прадастаўляцца бізнесу на бязвыплатнай аснове;

забяспечыць ажыццяўленне адміністрацыйных працэдур у электронным выглядзе, пачынаючы ад падачы заявак і заканчваючы атрыманнем вынікаў у выглядзе электроннага дакумента.

Плануецца спрасціць перадачу аб'ектаў нерухомасці, якія не выкарыстоўваюцца і знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы, для стварэння вытворчага бізнесу і новых працоўных месцаў.

Інструменты эканамічнага рэгулявання будуць накіраваны на падтрыманне добрасумленнай канкурэнцыі і процідзеянне манапалізму.

Прамое рэгуляванне цэн і тарыфаў будзе захавана толькі на паслугі, якія аказваюць прадпрыемствамі, што займаюць дамінуючае становішча на таварных рынках, і натуральнымі манаполіямі, а таксама на асобныя групы тавараў (у прыватнасці на паліва, электра- і цеплаэнергію).

Для эфектыўнага забеспячэння роўных канкурэнтных умоў гаспадарання на базе Міністэрства гандлю ствараецца антыманапольны орган Рэспублікі Беларусь.

Рэалізацыя намечаных мер дасць магчымасць сфарміраваць паўнавартаснае канкурэнтнае асяроддзе, устанавіць адзіныя правілы вядзення бізнесу.

Вынікам рашэння пастаўленых задач стане рост долі суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў агульным аб'ёме валавой дабаўленай вартасці з 28,7 працэнта ў 2014 годзе да 40 працэнтаў у 2020 годзе.

**3. Зніжэнне інфляцыі і працэнтных ставак**

Асноўная мэта грашова-крэдытнай палітыкі — зніжэнне да канца 2020 года ўзроўню інфляцыі да 5 працэнтаў.

Гэта азначае:

для эканомікі — макрастабільнасць;

для прадпрыемстваў — даступныя крэдыты;

для кожнага грамадзяніна — спыненне росту цэн.

Стаўка рэфінансавання стане базавым інструментам рэгулявання ўзроўню працэнтных ставак у эканоміцы.

Па выніках 2017 года ўзровень працэнтных ставак па новых крэдытах у нацыянальнай валюце прагназуецца ў памеры 17-18 працэнтаў гадавых, 2018 года — 14-15 працэнтаў гадавых, 2019 года — 11-12 працэнтаў гадавых, 2020 года — 9-11 працэнтаў гадавых.

Развіццё канкурэнцыі ў банкаўскім сектары і ўкараненне сучасных тэхналогій прывядзе да зніжэння кошту і росту даступнасці банкаўскіх паслуг.

Курсавая палітыка застанецца гнуткай. Золатавалютныя рэзервы істотна павялічацца і будуць падтрымлівацца на бяспечным узроўні.

**4. Стварэнне паўнавартаснага фінансавага рынку**

Паўнавартасны фінансавы рынак — абавязковая ўмова ўстойлівага эканамічнага росту.

Ключавыя задачы — забеспячэнне гарантый захаванасці укладаў насельніцтва, устойлівасці банкаўскай сістэмы краіны, прыцягненне інвестыцый і найноўшых тэхналогій у фінансавы сектар.

Развіццё фінансавага рынку дасць насельніцтву прывабныя сферы ўкладання грошай.

Плануецца забяспечыць свабодную куплю-продаж акцый айчынных і замежных арганізацый усіх формаў уласнасці.

Будзе **лібералізавана валютная сістэма.** Мяркуецца, што тэрміны вяртання валютнай выручкі ў краіну будуць вызначацца ў кантрактах, будуць адменены абавязковы продаж і мэтавая купля замежнай валюты, абмежаванні на адкрыццё рахункаў у замежных банках.

Для рэальнага сектара эканомікі фінансавы рынак прадаставіць новыя, больш даступныя крыніцы фінансавання: карпаратыўныя аблігацыі, праектнае фінансаванне, размяшчэнне акцый беларускіх прадпрыемстваў на міжнародных фондавых біржах пры дапамозе замежных дэпазітарных распісак.

Забеспячэнне макраэканамічнай стабільнасці разам з мерамі па паляпшэнні інвестыцыйнага клімату створыць аснову для паляпшэння суверэннага крэдытнага рэйтынгу краіны, беларускіх банкаў і прадпрыемстваў. Гэта дазволіць істотна аблегчыць доступ прадпрыемстваў да фінансавых рэсурсаў для інвестыцыйнага развіцця.

Працягнецца ўдасканаленне дзейнасці Банка развіцця Рэспублікі Беларусь як дзяржаўнага інстытута падтрымкі прыярытэтных напрамкаў развіцця эканомікі. Асноўны акцэнт будзе зроблены на крэдытаванні экспарту, фінансаванні інвестыцыйных праектаў, у тым ліку дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

Узрасце даступнасць фінансавых паслуг для насельніцтва і прадпрыемстваў праз паскоранае развіццё сучасных інфармацыйных тэхналогій. Усе атрымаюць магчымасць ажыццяўляць шырокі спектр банкаўскіх аперацый дыстанцыйна, не прыходзячы ў банк. Гэта прывядзе да скарачэння аперацыйных выдаткаў банкаў і, адпаведна, **зніжэння кошту банкаўскіх паслуг для карыстальнікаў.**

**5. Фінансавае аздараўленне рэальнага сектара эканомікі**

Прадугледжваецца дыферэнцаваны падыход да аднаўлення плацежаздольнасці арганізацый рэальнага сектара эканомікі. Фінансавае аздараўленне прадпрыемстваў стане асновай для павышэння дысцыпліны ўзаемаразлікаў, зніжэння ўзроўню крэдыторскай і дэбіторскай запазычанасці.

Дэфіцыт уласных абаротных сродкаў прадпрыемстваў будзе ліквідаваны шляхам:

паскарэння іх абарачальнасці з дапамогай недапушчэння росту складскіх запасаў і дэбіторскай запазычанасці;

паслядоўнага зніжэння ставак па крэдытах, што паменшыць адток абаротных сродкаў;

кропкавай рэструктурызацыі бягучых абавязацельстваў, у тым ліку з выкарыстаннем карпаратыўных каштоўных папер і аблігацый урада;

зніжэння ўсіх відаў выдаткаў у адпаведнасці з патрабаваннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Пытанні аказання дзяржпадтрымкі без выканання гэтага патрабавання разглядацца не будуць;

прыцягнення інвестараў.

Адначасова прадугледжваецца кіраванае вывядзенне з эканомікі неплацежаздольных вытворчасцяў, выдаткі на падтрымку якіх перавышаюць аддачу ад іх, уцягванне ў эканамічны абарот іх актываў і эфектыўнае выкарыстанне працоўных рэсурсаў, якія вызваляцца. Пры гэтым будуць забяспечаны сацыяльная абарона работнікаў, актыўны ўдзел прафсаюзных арганізацый у вырашэнні задач стварэння новых і аптымізацыі дзейных працоўных месцаў.

**6. Збалансаваны бюджэт без росту падатковай нагрузкі**

Бюджэтна-падатковая палітыка ў бягучай пяцігодцы будзе накіравана на павышэнне эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў і іх канцэнтрацыю на прыярытэтных кірунках сацыяльна-эканамічнага развіцця, далейшую аптымізацыю падатковай сістэмы.

**У бюджэтнай палітыцы будуць забяспечаны:**

бездэфіцытны бюджэт;

пераход да трохгадовага бюджэтнага планавання;

аптымізацыя механізмаў размеркавання даходаў бюджэтаў;

шырокае ўкараненне бюджэтавання, арыентаванага на вынік;

аказанне дзяржаўнай падтрымкі на аснове роўнага доступу, канкурэнцыі і адпаведнасці рынычным патрабаванням;

паступовае скарачэнне дзяржаўнага доўгу.

Будзе захавана **сацыяльная накіраванасць** бюджэтных расходаў, а таксама павялічана доля выдаткаў на **інавацыйнае развіццё.**

У мэтах забеспячэння ўстойлівага рэгіянальнага развіцця нарматывы адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін), якія фарміруюць асноўны аб'ём даходаў бюджэтаў раённага і гарадоў абласнога падпарадкавання, будуць захаваны на тэрмін не менш за тры гады. Гэта павысіць самастойнасць мясцовай улады ў правядзенні палітыкі рэгіянальнага развіцця, з'явяцца дадатковыя стымулы для падтрымкі бізнесу і стварэння новых працоўных месцаў.

Мерапрыемствы ў галіне **падатковай палітыкі** будуць накіраваны на падтрыманне аптымальнага ўзроўню падатковай нагрузкі на эканоміку, стымулюючага эканамічны рост. Узровень падатковай нагрузкі не павялічыцца і складзе не больш за 26 працэнтаў ад ВУП.

Для дасягнення гэтай мэты мяркуецца:

увядзенне мараторыя на пагаршэнне падатковага заканадаўства;

*Праект*

# АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ на 2016—2020 гады

павышэнне эфектыўнасці падатковай сістэмы для стымулявання інвестыцыйнай і інавацыйнай актыўнасці;

удасканаленне падыходаў да збірання падатку на нерухомасць і экалагічнага падатку;

вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць унутрыхолдынгавых абаротаў тавараў (работ, паслуг);

забеспячэнне пераходу на электроннае абслугоўванне плацельшчыкаў.

Будзе ўведзены інстытут «падатковых дэпазітаў», якія стымулююць вывад даходаў і капіталу з ценю. Рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, якія задэклараваылі даходы звыш вызначанай дзяржавай сумы і заплацілі з іх падаткі, будзе гарантавана безумоўнае захаванне падатковай і камерцыйнай тайны.

**7. Мадэрнізацыя адносін уласнасці**

Захаванне дзяржаўнай уласнасці або пашырэнне прыватнай — не самамэта. Яны павінны быць эфектыўнымі і прыбытковымі.

Прадугледжваюцца:

перадача ў камунальную ўласнасць прадпрыемстваў, якія не маюць стратэгічнага значэння, у мэтах прыцягнення інвестараў у акцыянерны капітал;

укараненне перадавых сусветных практык карпаратыўнага кіравання на дзяржаўных прадпрыемствах з усталяваннем галоўнага крытэрыя для кіраўніка — максімізацыя прыбытку;

актывізацыя малой і сярэдняй прыватызацыі, арыентаванай на прыцягненне інвестыцый, мадэрнізацыю вытворчасцей і стварэнне новых працоўных месцаў;

прыцягненне вядучых сусветных кампаній (з капіталізацыяй больш за мільярд долараў) у Рэспубліку Беларусь для рэалізацыі праектаў з высокай дабаўленай вартасцю;

выпуск акцый найбуйнейшых кампаній на міжнародных біржах Лондана, Нью-Ёрка, Франкфурта з мэтай росту капіталізацыі гэтых прадпрыемстваў і зніжэння пазыковай нагрузкі.

Міністрам, старшыням аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама будуць прадастаўлены дадатковыя правы на адчужэнне часткі акцый дзяржаўных прадпрыемстваў.

Плануецца зацвярджэнне спрошчанага парадку рэгулявання адносін уласнасці, уключаючы радыкальнае скарачэнне пераліку дакументаў і ўзгадненняў.

У якасці абавязковых умоў — наяўнасць эфектыўнага бізнес-плана, гадавой справаздачы і аўдытарскага заключэння аб сур'ёзнасці інвестара. Працэс прыцягнення інвестараў будзе празрыстым і канкурэнтным.

**8. Павышэнне эфектыўнасці інвестыцый, прыцягненне прамых замежных інвестыцый**

Інвестыцыйная палітыка будзе грунтавацца на рынкавых прынцыпах прадастаўлення інвестыцыйных рэсурсаў, эфектыўнасці іх выкарыстання, паляпшэнні дзелавога клімату.

У новай пяцігодцы прыярытэты інвестыцыйнай палітыкі перамяшчаюцца ў рэальны сектар, а дакладней — у праекты з высокай акупнасцю. Гэта прадугледжвае перш за ўсё аднаўленне актыўнай часткі асноўных сродкаў, набыццё перадавых тэхналогій, інфармацыйных сістэм, робататэхнікі.

Асноўнымі напрамкамі выкарыстання інвестыцый стануць:

стварэнне высокаэфектыўных і экспартна арыентаваных вытворчасцяў, новых працоўных месцаў у сферы паслуг;

рэалізацыя прыярытэтных праграм у сацыяльнай сферы;

будаўніцтва аб'ектаў інжынернай інфраструктуры, у тым ліку Беларускай АЭС.

Прадастаўленне дзяржаўнай падтрымкі і льготных крэдытных рэсурсаў на выкананне інвестыцыйных праектаў будзе ажыццяўляцца на конкурснай аснове ў рамках дзяржаўных праграм з улікам іх накіраванасці на рэалізацыю прыярытэтных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Інвестыцыі, якія не маюць прамога эканамічнага эфекту і акупнасці, але накіраваны на забеспячэнне нацыянальнай бяспекі і вырашэнне стратэгічна важных для краіны сацыяльных пытанняў, будуць ажыццяўляцца ў межах бюджэтных магчымасцяў.

Інвестыцыйныя патокі з дзяржаўнай падтрымкай па ключавых напрамках сканцэнтраваны ў 20 дзяржаўных праграмах. У 2016—2020 гадах будзе рэалізавана больш за 80 буйных інвестыцыйных праектаў з аб'ёмам інвестыцый больш за 27 млрд долараў ЗША. У іх ліку будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Рэспубліцы Беларусь; арганізацыя вытворчасці легкавых аўтамабіляў у Рэспубліцы Беларусь СЗАТ «Белджы», стварэнне Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень», распрацоўка радовішчаў калійных угнаенняў з будаўніцтвам горна-абагачальных комплексаў у Петрыкаўскім і Старобінскім раёнах, будаўніцтва завода па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы на базе ААТ «Светлагорскі ЦКК», будаўніцтва завода па вытворчасці металічнага ліста і белай бляхі ААТ «ММПЗ-груп», праектаванне і будаўніцтва эксперыментальнага шматфункцыянальнага комплексу «Мінск-Мір» і іншыя.

Прыярытэтнай крыніцай мадэрнізацыі эканомікі ў бягучай пяцігодцы з'яўляюцца *прамыя замежныя інвестыцыі*.

Задачам іх актыўнага прыцягнення і эфектыўнага выкарыстання будуць падпарадкаваны ўсе інструменты эканамічнай палітыкі.

Прадугледжваюцца безумоўнае забеспячэнне права інвестара на распараджэнне атрыманым прыбыткам і дывідэндамі, свабодны рух капіталу, удасканаленне сістэмы гарантый для міжнародных інвестараў на аснове найлепшай сусветнай практыкі.

Плануюцца паглыбленне вытворчай кааперацыі і прамысловага супрацоўніцтва ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, уключэнне беларускіх кампаній у глабальныя ланцужкі стварэння дабаўленай вартасці.

Статус Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі будзе павышаны, а яго паўнамоцтвы пашыраны.

Ключавым паказчыкам эфектыўнасці работы міністраў і губернатараў стане аб'ём прыцягнення прамых замежных інвестыцый.

Прытоку дадатковых фінансавых сродкаў у эканоміку будзе спрыяць далейшае развіццё супрацоўніцтва з міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі.

Рэалізацыя інвестыцыйных праектаў на прынцыпах дзяржаўна-прыватнага партнёрства, эфектыўнае размеркаванне рызык і адказнасці паміж бізнесам і дзяржавай дазволіць рэалізаваць доўгатэрміновыя інфраструктурныя праекты.

Доля інвестыцый у асноўны капітал будзе падтрымлівацца на ўзроўні эканамічнай бяспекі — не менш за 25 працэнтаў да ВУП.

**9. Эфектыўнае дзяржаўнае кіраванне**

Самая сучасная вытворчасць дасць жаданую аддачу толькі пры эфектыўным кіраванні. Таму ў бягучай пяцігодцы нароўні з далейшай комплекснай мадэрнізацыяй базавых галін і паскораным фарміраваннем новых высокатэхналагічных сектараў прадугледжваецца **абнаўленне сістэмы кіравання эканомікай.**

У гэтых мэтах прадугледжваецца:

размежаванне функцый дзяржавы як рэгулятара і ўласніка;

скарачэнне залішніх і дублюючых функцый органаў дзяржаўнага кіравання, кантрольных (наглядных) і праваахоўных органаў;

пашырэнне паўнамоцтваў і сфер адказнасці органаў мясцовага кіравання і самакіравання;

умацаванне пазіцый Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне;

фарміраванне кампактнага ўрада;

перавод да 2020 года ўсіх адміністрацыйных працэдур у электронны фармат;

павышэнне прэстыжу дзяржаўнай службы;

арганізацыя сістэмы стажыровак дзяржаўных служачых у вядучых сусветных адукацыйных цэнтрах.

У выніку паслядоўнай рэалізацыі намечаных захадаў будзе створаны эфектыўны кампактны дзяржаўны апарат.

**10. Дакладныя крытэрыі ацэнкі кіруючых кадраў**

Галоўная мэта — павысіць эфектыўнасць кіравання: даць кіраўнікам усіх узроўняў свабоду дзеянняў, прадаставіўшы неабходныя паўнамоцтвы для прыняцця рашэнняў, права на рызыку, ініцыятыву, пры ўзмацненні персанальнай адказнасці за стан спраў на даручаным участку работы, укараненні дзейсных матывацыйных механізмаў.

Ацэнка эфектыўнасці работы кадраў па выкананні Праграмы будзе ажыццяўляцца, зыходзячы з найважнейшых крытэрыяў, прадугледжаных ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 лютага 2016 года № 78 «Аб мерах па павышэнню эфектыўнасці сацыяльна-эканамічнага комплексу Рэспублікі Беларусь».

## СКЛАДНІКІ РОСТУ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ ЭКАНОМІКІ, ЗАСНАВАНАГА НА ІНАВАЦЫЯХ

**Лічбавая трансфармацыя эканомікі (інфарматызацыя)**

У бягучай пяцігодцы ў сферы інфарматызацыі нам трэба будзе вырашыць **дванаццаць ключавых задач.**

**1. Стварэнне адной з самых сучасных інфраструктур тэлекамунікацый ва Усходняй Еўропе.** Рэалізацыя праграмы «Оптавалакно ў кожны дом». Пашырэнне праекта стварэння сотавай сувязі чацвёртага пакалення на тэрыторыі ўсёй краіны. Па меры распрацоўкі **найноўшага стандарту сувязі пятага пакалення** мы запусцім адпаведныя пілотныя зоны на тэрыторыі Беларусі.

Узровень пранікнення інтэрнэту да 2020 года складзе мінімум 80 працэнтаў хатніх гаспадарак.

**2. Стварэнне паўнавартаснага электроннага ўрада.** Арыенцір па якасці і паўнаце электронных паслуг — Паўднёвая Карэя (сусветны лідар у гэтай вобласці). Да 2020 года ўсе базавыя адміністрацыйныя паслугі павінны аказвацца ў электронным выглядзе. Усе жыхары краіны будуць мець магчымасць выкарыстоўваць **электронны подпіс.**

Атрымаць любыя дакументы, даведкі можна будзе хутка, лёгка і зручна, усе адміністрацыйныя працэдуры стануць празрыстымі.

3. Стандартам для новых дамоў і кватэр павінна стаць сістэма **«Разумны дом».** Ва ўсім новапабудаваным жыллі грамадзяне будуць мець магчымасць выкарыстоўваць гэтую сістэму.

4. Максімальнае ўкараненне ва ўсе галіны эканомікі тэхналогій збору і апрацоўкі вялікіх масіваў даных, перш за ўсё ў медыцыне, гандлі і сельскай гаспадарцы.

5. Вывучэнне магчымасцяў выкарыстання найноўшых тэхналогій перадачы і захоўвання інфармацыі ў банкаўскай сферы, дзяржаўным кіраванні, натарыяце і іншых.

6. Здыманне ўсіх адміністрацыйных бар'ераў, якія замінаюць развіццю электроннага гандлю, а таксама выкарыстанню вядучых сусветных і рэгіянальных плацежных сістэм.

7. Абсталяванне ўсіх школ краіны высакахуткасным бесправаднымі інтэрнэтам. Шырокае выкарыстанне **электронных сродкаў навучання** (электронныя дзённік, журнал, падручнік і іншыя).

8. У транспартнай сферы — стварэнне аўтаматызаваных сістэм маніторынгу і кіравання станам транспартнай інфраструктуры, укараненне інтэлектуальных комплексаў рэгулявання дарожнага руху, сістэм уліку паліўных рэсурсаў.

9. У прамысловасці — укараненне аўтаномных вытворчых комплексаў, сістэм кіравання на аснове канцэпцыі «Інтэрнэт рэчаў», тэхналогій трохмернага друку, поўная лічбавая інтэграцыя інжынерна-канструктарскіх работ па ўсім ланцужку стварэння кошту.

10. У сельскай гаспадарцы — **пераход да дакладнага земляробства,** заснаванага на шырокім выкарыстанні даных спадарожнікавых сістэм сувязі і навігацыі, аўтаматызаваных сістэм збору інфармацыі і кіравання працэсамі.

11. У жыллёва-камунальнай гаспадарцы — паўсюднае ўкараненне сістэм аўтаматычнага ўліку і рэгулявання спажывання паліўна-энергетычных рэсурсаў, кантролю за тэхнічным станам аб'ектаў інфраструктуры, паўнатой і правільнасцю налічэння і аплаты жыллёва-камунальных паслуг.

12. Стварэнне ў Рэспубліцы Беларусь прававога, адукацыйнага і інвестыцыйнага асяроддзя (уключаючы пытанні падаткаабкладання, абароны інтэлектуальнай уласнасці і інвестыцый, руху капіталу), максімальна спрыяльнага для развіцця лічбавых тэхналогій, новых тэхналагічных праектаў, бізнесу ў сферы інфармацыйных тэхналогій і іншага.

**Комплекснае развіццё нацыянальнай інавацыйнай сістэмы**

Інтэнсіўнаму інавацыйнаму развіццю нацыянальнай эканомікі будзе садзейнічаць правядзенне стымулюючай бюджэтна-падатковай, грашова-крэдытнай і інвестыцыйнай палітыкі.

Павысіцца роля галіновай і фундаментальнай навукі, будзе забяспечана яе інтэграцыя з вытворчасцю. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі павінна стаць інавацыйна-вытворчай карпарацыяй для фарміравання высокатэхналагічнага сектара на ўласнай дасведчай і тэхналагічнай базе. Асаблівая роля ёй належыць у інтэнсіўным развіцці касмічнай дзейнасці, нана- і біяіндустрыі, робататэхнікі.

*Развіццё рынку навукова-тэхнічнай прадукцыі* будзе забяспечана за кошт спрашчэння ўмоў камерцыялізацыі вынікаў навукова-тэхнічнай дзейнасці, якія належаць дзяржаве, гарантаванага забеспячэння аховы, абароны і кіравання аб'ектамі інтэлектуальнай уласнасці на ўнутраным і знешнім рынках.

*Інавацыйная інфраструктура* ўмацуецца індустрыяльнымі пляцоўкамі для стварэння высокатэхналагічных вытворчасцяў.

*Стымуляванне інавацыйнага прадпрымальніцтва* плануецца ажыццявіць за кошт пашырэння грантавай формы фінансавання навуковых і інавацыйных праектаў.

Узровень навукаёмістасці ВУП за кошт усіх крыніц фінансавання перавысіць 1 працэнт.

**Паскоранае фарміраванне высокатэхналагічнага сектара**

Стаўка будзе зроблена на:

індустрыю інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

атамную і аднаўляльную энергетыкі;

бія- і нанатэхналогіі;

фармацэўтычную прамысловасць;

прыборабудаванне і электронную прамысловасць.

Паблізу Беларускай АЭС будзе створаны кластар электраёмістых інавацыйных вытворчасцяў, ажыццёўлены пераход на электраабагрыванне памяшканняў у жыллёвым будаўніцтве.

Мяркуецца асвоіць новыя тэхналогіі:

паглыбленай перапрацоўкі малочнай і мясной сыравіны з выкарыстаннем метадаў біяхімічнай мадыфікацыі;

вытворчасці інавацыйных біяўгнаенняў;

выпуску **новых лекавых сродкаў** (процірухлінная, антыарытмічная і антымікробнага лячэбнага дзеяння).

Будзе сфарміраваны **інавацыйна-прамысловы комплекс** у сферы распрацоўкі і вытворчасці **складанай медыцынскай тэхнікі,** сістэм забеспячэння бяспекі, абсталявання неразбуральнага кантролю і аналітычнага прыборабудавання.

У **мікраэлектроніцы** будзе асвоена вытворчасць матрыц для сістэм апрацоўкі інфармацыі касмічных лятальных апаратаў, паўправадніковых прыбораў магутнай сілавой і высакавольтнай электронікі, высокачастотных мікрасхем і мікрасістэм.

Паскоранае развіццё атрымаюць **фатоніка** (оптыка, лазерная і цеплавізійная тэхніка, іншая тэхніка двайнога прызначэння), а таксама **вытворчасць электрычнага транспарту і аўтакампанентаў да яго.**

Будзе асвоена вытворчасць **новых канструкцыйных матэрыялаў** для медыцыны, машынабудавання і будаўніцтва.

Плануецца арганізацыя серыйнай вытворчасці беспілотных авіяцыйных комплексаў.

Будзе створана сетка нацыянальных дасведчых лабараторый (цэнтраў) і інавацыйна-прамысловых аб'яднанняў, арыентаваных на рэалізацыю поўнага інавацыйнага цыкла. Цэнтралізацыя сродкаў інавацыйных фондаў дазволіць сканцэнтраваць рэсурсы для мэтавага фінансавання праектаў і мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця.

У выніку намечаных захадаў удзельная вага высокатэхналагічных відаў дзейнасці ў агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці павялічыцца з 3,2 працэнта ў 2015 годзе да 4-6 працэнтаў у 2020 годзе.

**Зніжэнне выдаткаў і павышэнне якасці прадукцыі**

Зніжэнне выдаткаў на вытворчасць і рэалізацыю прадукцыі з'яўляецца ключавым рэзервам павышэння фінансавай устойлівасці і прыбытковасці працы арганізацый.

Дзяржаўная падтрымка суб'ектам гаспадарання ў бягучым пяцігоддзі будзе аказвацца толькі пры ўмове істотнага скарачэння матэрыяла- і энергаёмістасці прадукцыі. Гэта будзе адным з ключавых паказчыкаў эфектыўнасці гаспадарання і крытэрыем стымулюючых выплат работнікам.

Асноўнымі напрамкамі зніжэння выдаткаў на вытворчасць і рэалізацыю прадукцыі (работ, паслуг) з'яўляюцца:

скарачэнне ўмоўна-пастаянных і невытворчых выдаткаў;

тэхналагічнае пераасначшэнне прамысловых вытворчасцяў;

вызначэнне прагрэсіўных нормаў расходу сыравіны, матэрыялаў за кошт скарачэння адходаў і страт у працэсе вытворчасці і захоўвання, выкарыстання другасных рэсурсаў;

укараненне сучасных сістэм кіравання рэсурсамі, аптымальных схем і крыніц энергазабеспячэння прамысловых аб'ектаў, рэжымаў іх работы.

Зніжэнне выдаткаў на вытворчасць і рэалізацыю прадукцыі (работ, паслуг) і павышэнне іх якасці стануць абавязковымі крытэрыямі пры фарміраванні і абароне штогадовых бізнес-планаў арганізацый.

Асаблівая ўвага будзе нададзена ўдасканаленню сістэм кіравання якасцю, уніфікацыі тэхнічных нарматыўных актаў з патрабаваннямі найбольш перспектыўных міжнародных стандартаў. Плануецца ўзмацненне кантролю за якасцю выканання галіновых тэхналагічных рэгламентаў.

*Праект*

# АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ на 2016—2020 гады

**Павышэнне канкурэнтаздольнасці традыцыйных галін прамысловасці**

Вытворчыя магутнасці айчынных прадпрыемстваў будуць аптымізаваны, зыходзячы з рэальнага попыту на выпускаемую прадукцыю на знешнім і ўнутраным рынках.

Прадугледжваюцца павышэнне тэхнічнага ўзроўню дзейных магутнасцяў і вывад з эксплуатацыі залішніх. Арыенцірам эфектыўнасці з'яўляюцца ўкараненне ў вытворчасць сучасных тэхналогій па выпуску прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю і стварэнне новых вытворчасцяў з узроўнем прадукцыйнасці працы, не ніжэйшым за сярэднееўрапейскі.

*Палітыка рацыянальнага імпартазамяшчэння* будзе накіравана як на павелічэнне лакалізацыі зборачных вытворчасцяў, так і на вытворчасць эканамічна эфектыўнай імпартазамяшчальнай прадукцыі. Мэтавая задача — стварэнне новых экспартна арыентаваных і імпартазамяшчальных вытворчасцяў.

Рэалізацыя гэтага напрамку дазволіць дасягнуць прыросту штогадовай выручкі ад рэалізацыі прадукцыі не менш як на 600 млн долараў ЗША ў прамысловасці і сферы паслуг.

*У вытворчасці машын і абсталявання* неабходна стварыць новыя мадыфікацыі трактароў, абсталяваных рухавікамі самых прагрэсіўных стандартаў, пашырыць вытворчасць энерганасычаных трактароў, асвоіць вытворчасць дызельных рухавікоў для аўтамабільнай, трактарнай і пазадарожнай тэхнікі экалагічнага класа Еўра-5 і Еўра-6.

*У аўтамабілебудаванні* трэба будзе асвоіць выпуск тэхнічна складаных вузлоў і дэталяў, пашырыць выкарыстанне сучасных кампазітных канструкцыйных матэрыялаў, электрамеханічных і гібрыдных сілавых установак, укараніць інтэлектуальныя сістэмы кантролю за тэхналагічнымі працэсамі і кіравання імі.

*У транспартным машынабудаванні* будзе асвоена вытворчасць малатанажных грузавых аўтамабіляў, мікра- і электрааўтобусаў, велікагрузных аўтамабільных кранаў і іншай тэхнікі, якая цяпер імпартуецца. Пашырыцца мадэльны шэраг прыгарадных і міжгародніх аўтобусаў. Будзе ўведзена першая чарга новага завода па выпуску легкавых аўтамабіляў.

*У вытворчасці электратэхнікі* плануецца асвоіць выпуск трансфарматараў для краін Еўрапейскага саюза з мінімальным узроўнем страт, электрарухавікоў павышанага і высокага класаў энергаэфектыўнасці, абсталявання для зборкі паўправадніковых прыбораў і інтэгральных мікрасхем, пашырыць асартымент бытавой тэхнікі з палепшанымі якаснымі характарыстыкамі.

*У металургіі* будзе створана вытворчасць спецыяльных сталяў, высокадакладнага ліцця, металакорду для буйнагабарытных і звышбуйнагабарытных шын, арганізавана лінія па вытворчасці труб нафтагазавага прызначэння, пабудаваны завод па выпуску тонкай белай бляхі для патрэб харчовай прамысловасці.

Развіццё *хімічнай вытворчасці* будзе ажыццяўляцца ва ўвязцы з мадэрнізацыяй нафтаперапрацоўкі. Прадугледжваюцца стварэнне магутнасцяў малатанажнай хіміі, сучасных комплексаў па вытворчасці поліэфірнай прадукцыі, арганізацыя вытворчасці азотнай кіслаты і асваенне выпуску новых відаў валокнаў, канструкцыйных матэрыялаў і вырабаў.

Выхад на поўную магутнасць мадэрнізаваных вытворчасцяў *у дрэваапрацоўцы і цэлюлозна-папяровай прамысловасці* дазволіць павялічыць з 42 да 60 працэнтаў долю прадукцыі глыбокай перапрацоўкі драўніны і замясціць экспарт драўнянай сыравіны прадукцыяй з высокай дабаўленай вартасцю.

Плануецца завяршыць мадэрнізацыю найбуйнейшых прадпрыемстваў *лёгкай прамысловасці* на базе найлепшых сусветных тэхналогій. Пашырыцца асартымент і вырасце канкурэнтаздольнасць прадукцыі тэкстыльнай, швейнай і гарбарнаабутковай галін. Курс будзе ўзяты на максімальнае замяшчэнне імпартнага адзення, абутку якаснымі і сучаснымі таварамі айчыннай вытворчасці. Важны ўклад будзе ўнесены прыватнымі вытворчымі прадпрыемствамі гэтай галіны, якія дынамічна развіваюцца. Плануецца паўсюднае распаўсюджванне вопыту работы Брэсцкай вобласці ў гэтым напрамку.

Галоўнымі мэтамі развіцця *энергетыкі* з'яўляюцца павышэнне эфектыўнасці і надзейнасці функцыянавання энергасістэмы з улікам уводу ў эксплуатацыю Беларускай АЭС, забеспячэнне патрэбнасці эканомікі рэспублікі і насельніцтва ў энергарэсурсах.

Чакаецца фарміраванне аптовага электраэнергетычнага рынку Рэспублікі Беларусь і яго інтэграцыя ў ствараны агульны рынак ЕАЭС.

Будзе забяспечана дыверсіфікацыя відаў і пастаўшчыкоў паліўнаэнергетычных рэсурсаў, у тым ліку шляхам будаўніцтва і паэтапнага ўводу ў эксплуатацыю двух блокаў Беларускай АЭС да 2021 года, нарошчвання аб'ёмаў выкарыстання мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсаў.

З 2019 года плануецца мінімізаваць імпарт электраэнергіі і рэалізаваць міжгаліновы комплекс захадаў па стымуляванні спажывання электраэнергіі ў сувязі з уводам у эксплуатацыю Беларускай АЭС, а таксама па яе эфектыўнай інтэграцыі ў энергасістэму краіны. Прадугледжваецца прыняць меры па экспарце электраэнергіі ў краіны Еўрапейскага саюза.

Да канца пяцігодкі будзе забяспечана скарачэнне выкарыстання прыроднага газу ў параўнанні з 2015 годам у аб'ёме каля 1,5 млн тон умоўнага паліва.

Удасканаленне тарыфнай палітыкі ў сферы электра- і цеплазабеспячэння будзе ажыццяўляцца праз больш жорсткі кантроль за ўзроўнем і структурай выдаткаў, скарачэння перакрыжаванага субсідавання, стымулявання энергаспажывання ў перыяд няпікавых нагрузак. Прадугледжваецца аптымізацыя тарыфаў на электраэнергію, якую выкарыстоўваюць для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння.

Зніжэнне сабекошту электрычнай і цеплавой энергіі будзе ажыццяўляцца за кошт рэалізацыі энергазабеспячальнымі арганізацыямі эксплуатацыйна-тэхнічных і энергазберагальных мерапрыемстваў, скарачэння невытворчых выдаткаў адміністрацыйна-кіраўніцкага персаналу і іншых выдаткаў, што ўключаюцца ў затраты на вытворчасць энергіі.

Асноўныя мэты *нафтаперапрацоўкі* — забеспячэнне эканамічна эфектыўнай вытворчасці найважнейшых відаў нафтапрадуктаў і сыравіны для нафтахімічнага комплексу, нарошчванне экспартнага патэнцыялу краіны. Для іх дасягнення прадугледжваецца рэалізацыя інвестыцыйных праектаў, накіраваных на павелічэнне глыбіні перапрацоўкі нафты і выхаду светлых нафтапрадуктаў, забеспячэнне адпаведнасці якасці выпускаемай прадукцыі дзейным і перспектыўным патрабаванням краін Еўрапейскага саюза.

У выніку рэалізацыі гэтых праектаў глыбіня перапрацоўкі нафты ў 2017—2018 гадах складзе 90 працэнтаў па кожным нафтаперапрацоўчым заводзе.

Асноўнай мэтай развіцця газавага сектара з'яўляецца надзейнае забеспячэнне прыродным газам спажыўцоў у запатрабаваных аб'ёмах.

У мэтах стрымлівання падзення здабычы нафты ў рэспубліцы будуць рэалізаваны інавацыйныя метады яе разведкі і здабычы. Плануецца пашырыць прысутнасць беларускіх кампаній на энергетычных рынках за мяжой.

Задачамі энергетычнай палітыкі застануцца зніжэнне энергаёмістасці валавога ўнутранага прадукту і забеспячэнне энергетычнай бяспекі Беларусі.

За гэту пяцігодку вытворчасць прамысловай прадукцыі павялічыцца на 9,1-15,2 працэнта.

**Забеспячэнне канкурэнтных пераваг у сельскай гаспадарцы**

Айчынная сельская гаспадарка выйдзе на якасна новы ўзровень развіцця за кошт павышэння фінансавай устойлівасці і тэхналагічнага ўзроўню. Працягнецца работа па прыцягненню ў аграпрамысловы комплекс прыватных інвестараў на прынцыпах акупнасці і эфектыўнасці.

Акцэнт будзе зроблены на строгім выкананні тэхналагічных патрабаванняў, забеспячэнні вытворчай дысцыпліны і эфектыўнай арганізацыі працы.

Наперадзе рашэнне наступных задач:

рэструктурызацыя і фінансавае аздараўленне неплацежаздольных сельскагаспадарчых арганізацый, удасканаленне сістэмы маёмасных адносін;

павышэнне адказнасці старшыняў райвыканкамаў за забеспячэнне бясстратнай работы сельскагаспадарчых арганізацый з улікам мер дзяржаўнай палітыкі ў аграпрамысловым комплексе;

нарошчванне і дыверсіфікацыя высокадаходнага экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавання;

фарміраванне механізму, які стымулюе сельскагаспадарчых вытворцаў да зніжэння выдаткаў і эфектыўнай дзейнасці;

удасканаленне сістэмы кіравання аграпрамысловым комплексам.

Павышэнне эфектыўнасці *раслінаводства* будзе забяспечвацца на аснове паглыблення спецыялізацыі вытворчасці прадукцыі з улікам глеба-кліматычных і эканамічных умоў гаспадарання, аптымізацыі структуры пасяўных плошчаў у адпаведнасці з занальнымі сістэмамі земляробства, удасканалення сартоў і стварэння высокаўраджайных культур.

Зніжэнне ўдзельнага ўзроўню затрат на вытворчасць прадукцыі раслінаводства будзе забяспечана праз шырокае выкарыстанне ў земляробстве інфармацыйных тэхналогій і ўкараненне дакладнага земляробства.

У выніку намечаных захадаў ураджайнасць збожжавых культур да 2020 года складзе не менш за 41 цэнтнер з гектара, што дасць магчымасць атрымаць да 10 млн тон збожжа.

Будзе вырашана задача па забеспячэнні патрэбнасці ўнутранага рынку ў асноўных відах плодаагародніннай прадукцыі, нарошчванні экспарту свежых гародніны, садавіны, ягад і прадуктаў іх глыбокай перапрацоўкі.

Развіццё *жывёлагадоўлі* будзе накіравана на павышэнне яго эфектыўнасці і пашырэнне экспартнай арыентаванасці.

Выкананню пастаўленых задач будуць спрыяць паляпшэнне селекцыйна-племяннай работы ў жывёлагадоўлі, забеспячэнне пагалоўя жывёлы і птушкі айчыннымі збалансаванымі кармамі, у тым ліку бялком.

Намечана завяршэнне раней пачатага будаўніцтва жывёлагадоўчых аб'ектаў з высокай ступенню будаўнічай гатоўнасці, запаўненне іх высокапрадуктыўнай племяннай жывёлай. Новае будаўніцтва будзе ажыццяўляцца на конкурснай аснове, зыходзячы з прынцыпаў акупнасці праекта і магчымасці забеспячэння вяртання крэдытных рэсурсаў, пацверджаных крыніц фінансавання.

Рэалізацыя намечаных захадаў дасць магчымасць павялічыць вытворчасць прадукцыі жывёлагадоўлі на 18,3 працэнта да ўзроўню 2015 года. Сярэдні надой малака ад каровы ў 2020 годзе складзе не менш за 6500 кілаграмаў; сярэднясутачныя прывагі на гадоўлі і адкорме буйной рагатай жывёлы — не менш за 700 грамаў, свіней — 600 грамаў, птушкі — 62 грамы.

Прадугледжваецца фарміраванне ўмоў для эфектыўнай вытворчасці і рэалізацыі арганічнай сельскагаспадарчай прадукцыі.

*Структурныя пераўтварэнні ў аграпрамысловым комплексе* прадугледжваюць:

удасканаленне сістэмы і механізмаў дзяржаўнага рэгулявання аграпрамысловага комплексу, у тым ліку праз аптымізацыі функцый і складу органаў дзяржаўнага кіравання;

стварэнне буйных кааператыўнаінтэграцыйных фарміраванняў, якія аб'ядноўваюць вытворчасць сельскагаспадарчай сыравіны, перапрацоўку і збыт канчатковай прадукцыі, у тым ліку прадуктовых кампаній (холдынгаў);

рэфармаванне стратных і неплацежаздольных сельскагаспадарчых арганізацый і іх фінансавае аздараўленне;

перадачу ў давернае кіраванне і продаж устойліва неплацежаздольных сельскагаспадарчых унітарных прадпрыемстваў як маёмасных комплексаў, пераход на новыя формы і метады прадпрымальніцкай дзейнасці, уключаючы развіццё малога аграбізнесу.

Рэалізацыя намечаных захадаў дасць магчымасць павялічыць рэнтабельнасць продажаў з 2,4 працэнта ў 2015 годзе да 10 працэнтаў у 2020 годзе, стварыць дадаткова не менш за 3,5 тыс. працоўных месцаў у сферы аграбізнесу, нарасціць экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання да 7,5 млрд долараў ЗША.

**Лес — багацце Беларусі**

Лес — каштоўны дар прыроды, лёгкія краіны. Поўная і эфектыўная перапрацоўка драўніны і адначасова зберажэнне лесу — вось дзве ключавыя задачы ў лясной галіне.

Базавыя напрамкі:

павелічэнне даходаў лясной гаспадаркі за кошт прыросту разліковай лесасекі і аптымізацыі працэнтных суадносін плошчаў эксплуатацыйных і ахоўных лясоў;

удасканаленне метадаў лесаўпарадкавання ў месцах з асабліва высокай інтэнсіўнасцю вядзення лясной гаспадаркі;

пашырэнне пасеву і пасадкі гаспадарча каштоўных парод, стварэнне плантацыйных лясных культур мэтавага прызначэння;

развіццё рынку паслуг па нарыхтоўцы драўніны;

тэхнічнае перааснашчэнне лясной гаспадаркі.

Плануецца павелічэнне працягласці дарожна-транспартнай сеткі ў лясным фондзе не менш чым на 600 кіламетраў за пяцігодку, а таксама комплексная механізацыя лесасечных работ з забеспячэннем долі нарыхтоўкі драўніны тэхнікай новага пакалення да 65 працэнтаў.

У выніку аб'ёмы нарыхтоўкі драўніны ў 2020 годзе ў параўнанні з 2015 годам павялічацца больш чым у 1,2 раза, а плошча лясоў не скароціцца.

Будзе сфарміраваны паўнавартасны рынак лясных рэсурсаў, які цалкам забяспечыць патрэбы айчыннай дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці.

**Рост эфектыўнасці будаўніцтва, забеспячэнне насельніцтва якасным і даступным жыллём**

Асноўнымі задачамі развіцця будаўнічага комплексу з'яўляюцца павышэнне якасці будаўніцтва і зніжэнне каштарыснага кошту будаўніцтва, рост экспарту будаўнічых паслуг.

Будуць створаны ўсе неабходныя ўмовы для актывізацыі жыллёвага будаўніцтва грамадзян і юрыдычных асоб.

У мэтах паляпшэння жыллёвых умоў насельніцтва, забеспячэння даступнасці жылля, што ўзводзіцца, прадугледжваецца далейшае развіццё рынку арэнднага жылля ва ўвязцы з фінансавымі рэсурсамі, у тым ліку за кошт сродкаў арганізацый і прыватных інвестараў.

Важным напрамкам развіцця жыллёвага будаўніцтва стане падтрымка індывідуальнага будаўніцтва, малапавярховага домабудавання, у тым ліку драўлянага.

У мэтах развіцця індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва будуць укараняцца прагрэсіўныя тэхналогіі, перш за ўсё модульныя канструкцыі, якія забяспечваюць высокія тэмпы і нізкі кошт будаўніцтва.

Вялікая ўвага будзе нададзена будаўніцтву шматкватэрнага даступнага і камфортнага жылля тыпавых спажывецкіх якасцяў з выхадам на 100-працэнтнае энергаэфектыўнае выкананне ў 2020 годзе.

Прадугледжваецца выдзяленне ў дастатковай колькасці зямельных участкаў пад індывідуальную забудову і іх забеспячэнне ў поўным аб'ёме інжынернай інфраструктурай (газазабеспячэнне, водазабеспячэнне, энергазабеспячэнне), уключаючы размешчаныя ў сельскай мясцовасці. Прадугледжваецца **актыўная забудова ў гарадах-спадарожніках,** вызначаных рашэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Мадэль іх развіцця будзе комплекснай — стварэнне сацыяльнай і вытворчай інфраструктуры, новых працоўных месцаў.

Для гэтага будуць укаранёны асаблівыя фінансавыя механізмы для будаўніцтва інфраструктуры за кошт мясцовых бюджэтаў і прыцягнення прыватнага капіталу.

Акцэнт будзе зроблены на ўкараненне прагрэсіўных схем: жыллёвых будаўнічых зберажэнняў, сучаснай сістэмы даступнага іпатэчнага крэдытавання, лізінгу жылых памяшканняў.

Будзе працягнута работа па стрымліванні росту кошту аднаго квадратнага метра агульнай плошчы жылля, у тым ліку таго, якое будуецца з дзяржаўнай падтрымкай, за кошт будаўніцтва жылля па праектах эканамічных жылых дамоў тыпавых спажывецкіх якасцяў і зніжэння выдаткаў на будаўніцтва на ўсіх стадыях інвестыцыйна-будаўнічага цыкла.

Фінансавыя сродкі, якія грамадзяне трацяць на набыццё і будаўніцтва жылля, будуць вызваленыя ад дэкларавання і прад'яўлення падатковых прэтэнзій.

Адным з ключавых паказчыкаў эфектыўнасці работы будаўнічага комплексу будзе адпаведнасць кошту квадратнага метра жылля сярэдняй заработнай плаце па краіне.

Прадугледжваюцца:

зніжэнне каштарыснага кошту будаўніцтва за кошт аптымізацыі выдаткаў па поўным цыкле будаўнічых работ (ад праектавання да ўводу ў эксплуатацыю аб'екта) і скарачэння іх працягласці;

укараненне сістэмы кіравання якасцю будаўнічых праектаў;

паляпшэнне спажывецкіх і эксплуатацыйных характарыстык будынкаў і збудаванняў, якія ўзводзяцца з паступовым іх набліжэннем да перадавых міжнародных стандартаў;

пашырэнне аб'ёмаў будаўніцтва аб'ектаў «пад ключ» і ўкараненне сучасных тэхналогій для ўзвядзення энергаэфектыўных і рэсурсаэканамічных, экалагічна чыстых будынкаў і збудаванняў;

актывізацыя ўдзелу ў падрадных таргах на будаўніцтва аб'ектаў за межамі краіны.

Плануецца забяспечыць больш шырокае прымяненне айчынных будаўнічых матэрыялаў з высокімі тэхнічнымі характарыстыкамі.

Доля выкарыстання айчынных сыравіны і матэрыялаў у будаўніцтве павялічыцца да 85 працэнтаў у 2020 годзе.

У выніку прынятых мер прадугледжваецца давядзенне долі індывідуальных жылых дамоў у агульным аб'ёме жылля, якое ўзводзіцца, да 40 працэнтаў, долі жылля ў малых гарадах — не менш як да 10 працэнтаў ад аб'ёму штогадовага ўводу ў эксплуатацыю агульнай плошчы жылля.

*Праект*

# АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ на 2016—2020 гады

За пяцігоддзе плануецца будаўніцтва 18 млн кв. метраў жылых памяшканняў, у тым ліку 1,55 млн кв. метраў для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў і якія маюць права на дзяржаўную падтрымку.

Рэалізацыя намечаных захадаў дасць магчымасць павысіць забяспечанасць насельніцтва жыллём у разліку на аднаго жыхара з 26,5 кв. метра ў 2015 годзе да 27,3 кв. метра ў 2020 годзе.

**Павышэнне якасці паслуг і зніжэнне выдаткаў у жыллёва-камунальнай гаспадарцы**

Асноўнымі мэтамі функцыянавання жыллёва-камунальнай гаспадаркі з'яўляюцца павышэнне эфектыўнасці і надзейнасці яго працы, прадастаўленне паслуг належнай якасці і ў запатрабаваных аб'ёмах пры адначасовым зніжэнні затрат на іх аказанне і забеспячэнні празрыстасці фарміравання кошту такіх паслуг.

Будзе працягнута комплексная аўтаматызацыя і дыспетчарызацыя аб'ектаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Удасканаленне структуры кіравання галіной прадугледжвае падзел функцый заказчыка і выканаўцы жыллёва-камунальных паслуг, развіццё канкурэнтнага асяроддзя і стварэнне ўмоў для прыцягнення ў сферу абслугоўвання і рамонту жыллёвага фонду арганізацый рознай формы ўласнасці.

Планава-разліковыя цэны ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы будуць фарміравацца на аснове прагрэсіўных стандартаў, недапушчэння звышнарматыўных страт і насіць стымулюючы характар. Сістэма зацвярджэння тарыфаў будзе празрыстай для спажыўцоў, а іх абгрунтаванасць — кантралявацца мясцовымі органамі ўлады і на рэспубліканскім узроўні.

Важнай задачай з'яўляецца зніжэнне залежнасці ад кошту імпартных энергарэсурсаў з дапамогай павелічэння долі мясцовых відаў паліва да 52 працэнтаў ад агульнага аб'ёму спажывання ў 2020 годзе.

Плануецца павялічыць аб'ёмы капітальнага рамонту жыллёвага фонду да 3 працэнтаў у год ад агульнай плошчы шматкватэрнага жылля, замяніць і мадэрнізаваць за пяцігоддзе больш за 11 тыс. ліфтаў, якія адпрацавалі нарматыўныя тэрміны эксплуатацыі.

У 2020 годзе ўсе спажыўцы краіны будуць забяспечаны вадой пітной якасці.

У 2016 годзе плануецца дасягнуць 50-працэнтнага ўзроўню кампенсацыі насельніцтвам затрат па ўсім комплексе жыллёва-камунальных паслуг за кошт зніжэння затрат арганізацый, якія аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі, і запланаванага павышэння тарыфаў.

Пачынаючы з 2017 года павышэнне ўзроўню кампенсацыі насельніцтвам затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг будзе ажыццяўляцца ва ўвязцы са зніжэннем затрат на іх аказанне, ростам даходаў насельніцтва.

Развіццё сістэмы безнаяўных жыллёвых субсідый будзе накіравана на мэтавую падтрымку ўразлівых слаёў насельніцтва, якія маюць патрэбу ў кампенсацыі за кошт сродкаў бюджэту часткі платы за жыллёва-камунальныя паслугі і платы за карыстанне жылымі памяшканнямі.

**Развіццё транзітнай прываблівасці і індустрыі гасціннасці**

Асновай развіцця транзітнай прываблівасці і стварэння індустрыі гасціннасці будзе павышэнне эфектыўнасці выкарыстання выгаднага геаграфічнага становішча краіны. Беларусь стане найбуйнейшым рэгіянальным лагістычным цэнтрам.

Гасціннасць як комплексная форма абслугоўвання турыстаў будзе ахопліваць транспартную сферу, гасцінічны і рэстаранны бізнес, забаўляльную індустрыю.

Пашырэння *транзітнага патэнцыялу* плануецца дасягнуць шляхам мадэрнізацыі міжнародных транспартных калідораў, якія праходзяць праз Рэспубліку Беларусь, пашырэння прапускной здольнасці пунктаў на дзяржаўнай мяжы. Асаблівы напрамак — развіццё беларускага ўчастка эканамічнага пояса Шаўковага шляху, які злучае еўрапейскі і еўразійскі рынкі.

Прадугледжваецца завяршыць будаўніцтва другой кальцавой аўтамабільнай дарогі вакол Мінска, хуткасных аўтадарог, якія злучаюць сталіцу з абласнымі цэнтрамі, і другой узлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце.

Будзе пабудавана і рэканструявана больш за 1 тыс. кіламетраў рэспубліканскіх дарог. Гэта практычна ў 2 разы больш, чым у папярэдняй пяцігодцы (565 кіламетраў).

Прадугледжваецца актыўнае развіццё ўнутранага воднага транспарту з выхадам на міжнародныя перавозкі.

Прадоўжыцца будаўніцтва *транспартна-лагістычных цэнтраў*, якія забяспечваюць поўны цыкл паслуг па дастаўцы грузаў кліенту «ад дзвярэй да дзвярэй» і максімальны спектр лагістычных паслуг.

Шырокае выкарыстанне магчымасцяў дзяржаўна-прыватнага партнёрства, канцэсійных пагадненняў дасць магчымасць прыцягнуць прыватны капітал у развіццё транспартнай інфраструктуры.

Развіццё *спажывецкага рынку* будзе накіравана на максімальна поўнае задавальненне патрэб насельніцтва у таварах і паслугах пераважна айчынных вытворцаў.

У гэтых мэтах прадугледжваюцца:

удасканаленне гандлёвай сеткі шляхам фарміравання аптымальных суадносін буйных рознічных гандлёвых сетак і крам крокавай даступнасці;

укараненне новых фарматаў продажу тавараў (гандлю па ўзорах, праз інтэрнэт-крамы);

стымуляванне вытворчасці і продажу айчынных тавараў і паслуг;

пашырэнне і абнаўленне абавязковага асартыментнага пераліку айчынных тавараў;

пашырэнне сферы ўжывання безнаяўных разлікаў з выкарыстаннем сучасных электронных плацежных інструментаў і сродкаў плацяжу.

Рэалізацыя намечаных захадаў па развіцці гандлю дасць магчымасць павысіць забяспечанасць насельніцтва гандлёвай плошчай з 551 да 620 кв. метраў на 1000 чалавек, павялічыць долю інтэрнэт-гандлю ў рознічным таваразвароце да 3,5 працэнта. Удзельная вага харчовых тавараў айчыннай вытворчасці ў агульным аб'ёме рознічнага таваразвароту ў 2020 годзе будзе складаць не менш за 85 працэнтаў.

У сферы грамадскага харчавання будзе працягнутая праца па аптымізацыі яе інфраструктуры, развіццю сеткі аб'ектаў хуткага абслугоўвання з беларускай нацыянальнай кухняй, укараненню сучасных тэхналогій прыгатавання ежы, актыўнаму развіццю прыдарожнага сэрвісу.

Выхад на якасна новы ўзровень развіцця *рынку турыстычных паслуг* будзе забяспечаны праз:

развіццё найбольш перспектыўных відаў турызму (культурна-пазнавальнага, медыцынскага, аздараўленчага, спартыўнага);

пасвабленне візавых патрабаванняў для ўязных турыстаў у мэтах прыцягнення большай колькасці замежных гасцей;

павышэнне якасці абслугоўвання турыстаў на аснове ўкаранення міжнародных стандартаў;

укараненне перадавых тэхналогій і інструментаў у сістэму прасоўвання турыстычных паслуг Беларусі на сусветным рынку;

выкарыстанне механізму дзяржаўна-прыватнага партнёрства для ўключэння айчынных і замежных інвестараў у развіццё турыстычнай інфраструктуры.

## РОСТ ЭКСПАРТУ І ВЫХАД НА НОВЫЯ РЫНКІ

У будучым пяцігоддзі знешнеэканамічная дзейнасць будзе накіравана на забеспячэнне збалансаванасці знешняга гандлю на аснове апераджальных тэмпаў росту экспарту, выкарыстання канкурэнтных пераваг краіны, эфектыўнага ўдзелу ў міжнародным падзеле працы і інтэграцыйных працэсах.

*Асноўныя напрамкі знешнеэканамічнай дзейнасці:*

павышэнне эфектыўнасці нацыянальнай сістэмы стымулявання і прасоўвання экспарту, яго мытнага адміністравання;

пераарыентацыя таварных патокаў на новыя перспектыўныя рынкі пры замацаванні пазіцый на традыцыйных рынках;

пашырэнне гандлёва-эканамічных сувязяў з рознымі краінамі, рэгіянальнымі аб'яднаннямі і міжнароднымі эканамічнымі арганізацыямі, у тым ліку з СГА.

Прыярытэтам знешняй палітыкі Беларусі на еўрапейскім вектары стане інтэнсіфікацыя партнёрства з краінамі Еўрапейскага саюза ў сферах гандлю і інвестыцый, транспарту, транзіту, трансгранічнага і рэгіянальнага супрацоўніцтва, спрашчэння візавага рэжыму, аховы навакольнага асяроддзя.

Будзе актывізавана праца па развіцці эканамічнага ўзаемадзеяння з краінамі «далёкай дугі» ў азіяцкім, лацінаамерыканскім, блізкаўсходнім і афрыканскім рэгіёнах, па выхадзе і замацаванні на рынках дзяржаў, якія маюць значны патэнцыял для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

Для вырашэння пастаўленых задач прадугледжваецца:

паляпшэнне таварнай структуры экспарту шляхам павелічэння долі высокатэхналагічнай і навукаёмістай прадукцыі, наменклатуры тавараў з высокай дабаўленай вартасцю, скарачэння ўдзельнай вагі сыравіннага экспарту;

апераджальнае развіццё экспарту паслуг, у тым ліку за кошт больш эфектыўнага выкарыстання транзітных магчымасцяў рэспублікі і паскоранага развіцця навукаёмістых відаў паслуг;

забеспячэнне пакетнага прынцыпу продажаў, які прадугледжвае прапанову з асноўным прадуктам комплексу спадарожных тавараў і паслуг (паўнавартаснае перад- і пасляпрадажнае абслугоўванне, кансультацыі, пастаўка запасных частак, расходных матэрыялаў);

дыверсіфікацыя экспарту;

стварэнне спецыялізаваных агенцтваў па прасоўванні экспарту, якое ажыццяўляецца суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, удасканаленне нацыянальнай сістэмы экспартнага фінансавання.

Важным вектарам знешнеэканамічнай дзейнасці з'яўляецца аднаўленне прысутнасці на традыцыйных рынках, у першую чаргу Расійскай Федэрацыі і ЕАЭС, рост экспарту ў Еўрапейскі саюз, засваенне і замацаванне беларускіх вытворцаў на новых нішах сусветнага рынку.

У лік найважнейшых напрамкаў знешнеэканамічнай дзейнасці ў бягучым пяцігоддзі ўваходзіць развіццё эканамічнай інтэграцыі ў рамках ЕАЭС.

Рэалізацыя гэтага кірунку прадугледжвае:

стварэнне ўмоў для развіцця адзінага рынку тавараў і паслуг шляхам сістэмнай работы па ліквідацыі выключэнняў і абмежаванняў ва ўзаемным гандлі краін — членаў ЕАЭС, фарміравання сумесных механізмаў страхавой, крэдытнай, лізінгавай, выставачна-кірмашовай падтрымкі экспарту;

фарміраванне ўзгодненай прамысловай, аграрнай, энергетычнай і транспартнай палітыкі;

паглыбленне вытворчай інтэграцыі, рэалізацыя сумесных навукова-вытворчых праграм развіцця прыярытэтных відаў эканамічнай дзейнасці.

Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі застанецца ядром інтэграцыйных працэсаў у рэгіёне СНД. Сумесныя беларуска-расійскія праекты ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, навукова-тэхнічным, ваенным і сацыяльным супрацоўніцтве ўзмоцняць канкурэнтныя перавагі суб'ектаў гаспадарання дзвюх краін на ўзаемавыгаднай аснове.

Будзе забяспечана планамерная дыверсіфікацыя экспарту для дасягнення роўнага размеркавання экспартных паставак паміж трыма рынкамі — ЕАЭС, Еўрапейскага саюза, краін «далёкай дугі» і іншых краін, што дасць магчымасць збалансаваць знешні гандаль Рэспублікі Беларусь, асвоіць новыя рынкі збыту і замацавацца на іх, скараціць рызыку залежнасці Рэспублікі Беларусь ад эканомікі асобных краін — гандлёвых партнёраў.

*Дыверсіфікацыя знешніх рынкаў* будзе ажыццяўляцца шляхам асваення рынкаў краін Еўрапейскага саюза, ЗША, Лацінскай Амерыкі, Усходняй Азіі, Бліжняга Усходу і Афрыкі, актывізацыі супрацоўніцтва з Кітаем і Індыяй.

Для развіцця гэтага напрамку неабходны распрацоўка і рэалізацыя рэгіянальных экспартных стратэгій, развіццё лагістычнай інфраструктуры, уключаючы ўласныя тэрміналы ў марскіх партах, выкарыстанне эканамічнай дыпламатыі і павышэнне ўзроўню кваліфікацыі спецыялістаў у галіне знешнеэканамічнай дзейнасці.

Галоўнымі індыкатарамі эфектыўнага развіцця знешнеэканамічных адносін з'яўляюцца рост экспарту тавараў і паслуг за пяцігоддзе на 21-25 працэнтаў, перавышэнне тэмпаў росту экспарту над імпартам, а таксама пастаўка на экспарт не менш як 65 працэнтаў выраблёнай прамысловай прадукцыі.

## РАЗВІЦЦЁ ЧАЛАВЕЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ І ПАВЫШЭННЕ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Сацыяльная палітыка дзяржавы будзе накіравана на забеспячэнне годнага ўзроўню і якасці жыцця беларускіх грамадзян, умацаванне дэмаграфічнага патэнцыялу.

**Паляпшэнне дэмаграфічнага патэнцыялу краіны і ўмацаванне здароўя народа**

Мэтай дэмаграфічнай палітыкі з'яўляюцца стабілізацыя колькасці насельніцтва і павелічэнне чаканай працягласці жыцця.

У ліку асноўных задач — умацаванне здароўя насельніцтва, развіццё сістэмы падтрымкі сем'яў з дзецьмі, рэгуляванне знешніх міграцыйных працэсаў.

*У сферы аховы здароўя* будзе забяспечвацца аказанне неабходнага аб'ёму якаснай медыцынскай дапамогі кожнаму жыхару незалежна ад яго месца пражывання. Многія віды высокатэхналагічнай дапамогі стануць звычайнай практыкай у рэгіёнах.

Працягнецца паэтапнае ўкараненне арганізацыі працы ўчастковай службы па прынцыпе ўрача агульнай практыкі, каманды — урач, памочнік ўрача па амбулаторна-паліклінічнай дапамозе, медыцынская сястра.

Плануецца ўвядзенне (будаўніцтва) аб'ектаў, у тым ліку ўстаноў аховы здароўя, у новых раёнах гарадоў, будаўніцтва спальнага корпуса цэнтра медыцынскай рэабілітацыі для дзяцей з псіханеўралагічнымі захворваннямі ў г. Брэсце, дыспансернага корпуса ДУ «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава», будаўніцтва дзіцячай бальніцы ў г. Гомелі.

Пашырацца пералікі платных медыцынскіх паслуг, уключаючы складаныя і высокатэхналагічныя аперацыі. Для гэтых мэт будуць створаны буйныя прыватныя медыцынскія цэнтры, у тым ліку за кошт замежных прыватных інвестараў з традыцыйна развітой медыцынай.

Завершыцца фарміраванне адзінай інфармацыйнай прасторы аховы здароўя, у тым ліку ўкараненне электроннай карты пацыента, электроннага рэцэпта, будзе забяспечана развіццё сродкаў тэлемедыцыны для паляпшэння якасці дыягностыкі і адукацыйнага працэсу, правядзенне маніторынгу стану здароўя.

Рэалізацыя гэтых мер дасць магчымасць забяспечыць у 2020 годзе:

павелічэнне чаканай працягласці жыцця да 75,3 года;

зніжэнне дзіцячай смяротнасці да ўзроўню не больш за 40,5 выпадку на 100 тыс. дзіцячага насельніцтва ва ўзросце ад 0 да 18 гадоў;

зніжэнне смяротнасці працаздольнага насельніцтва да 3,8 выпадку на 1 тыс. чалавек;

павелічэнне долі ўрачоў, якія працуюць па прынцыпе ўрача агульнай практыкі, у сістэме аказання першаснай медыцынскай дапамогі да 100 працэнтаў.

*Падтрымка сем'яў з дзецьмі, умацаванне інстытута* сям'і з'яўляюцца агульнанацыянальнымі задачамі ў бягучым пяцігоддзі. Палітыка дзяржавы будзе накіравана на развіццё сістэмы аховы здароўя маці і дзіцяці, удасканаленне формаў сацыяльнай абароны сем'яў з дзецьмі.

Працягнецца выкарыстанне створаных механізмаў падтрымкі сям'і — фарміраванне сямейнага капіталу, аказанне матэрыяльнай дапамогі шматдзетным сем'ям да навучальнага года, прадастаўленне шырокага спектра сацыяльных паслуг сем'ям з дзецьмі.

Адным з галоўных кампанентаў дзяржаўнай сямейнай палітыкі стане ўмацаванне сямейных каштоўнасцяў шляхам развіцця інфармацыйнага асяроддзя ў мэтах фарміравання ў грамадстве пазітыўнага вобразу сям'і з дзецьмі, рэалізацыі мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне прэстыжу сям'і і забеспячэнне сямейнага дабрабыту.

Гэта дазволіць замацаваць станоўчыя тэндэнцыі нараджальнасці і забяспечыць павышэнне каэфіцыента нараджальнасці з 12,5 праміле ў 2015 годзе да 13 праміле ў 2020 годзе.

*Асноўная задача міграцыйнай палітыкі* Рэспублікі Беларусь — павышэнне эфектыўнасці кіравання міграцыйнымі патокамі.

Рэгуляванне знешніх міграцыйных працэсаў будзе накіравана на садзейнічанне перасяленню суайчыннікаў, якія пражываюць за мяжой, на пастаяннае месца жыхарства ў Рэспубліку Беларусь, прыняцце мер па скарачэнні адтоку адукаванай моладзі з краіны, а таксама па замацаванні замежных спецыялістаў у арганізацыях рэспублікі.

У цэлым вынікам рэалізацыі намечаных мер дэмаграфічнай палітыкі павінна стаць стабілізацыя колькасці насельніцтва на ўзроўні 9,5 млн чалавек.

**Забеспячэнне эфектыўнай занятасці насельніцтва**

Дзяржаўная палітыка будзе накіравана на забеспячэнне эфектыўнай занятасці насельніцтва, павышэнне канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы на рынку працы і яе тэрытарыяльнай мабільнасці.

Будзе забяспечаны пераход ад палітыкі захавання працоўных месцаў да палітыкі атрымання максімальнага эфекту ад аднаго працоўнага месца, удасканалення структуры занятасці шляхам пераразмеркавання рабочай сілы сектары эканомікі, якія растуць, уключаючы высокатэхналагічную і навукаёмістую сферы.

*Праект*

# АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ на 2016—2020 гады

Асаблівая ўвага будзе нададзена прадастаўленню першага працоўнага месца ўсім выпускнікам устаноў вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Важнай задачай застаецца ўдасканаленне прафесійнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў у адпаведнасці з патрэбамі эканомікі. Прадугледжваецца забяспечыць скарачэнне прафесійна-кваліфікацыйнага дысбалансу попыту і прапановы працоўных месцаў шляхам арганізацыі апераджальнай прафесійнай перападрыхтоўкі работнікаў, укаранення новых формаў навучання, у першую чаргу непасрэдна на вытворчасці.

Рэструктурызацыя вытворчасці будзе насіць сацыяльна адказны характар, а таксама будзе накіравана на змякчэнне яе негатыўных наступстваў і садзейнічанне працаўладкаванню грамадзян на новыя працоўныя месцы — не менш за 50 тыс. штогод.

Рэалізацыя мер па павышэнні працоўнай мабільнасці рабочай сілы будзе спрыяць пераразмеркаванню кадраў у рэгіёны з дэфіцытам працоўных рэсурсаў.

Працягнецца работа па стымуляванні эканамічнай актыўнасці незанятага насельніцтва пры дапамозе развіцця прадпрымальніцтва, пашырэння гнуткіх формаў працоўнай дзейнасці, надомнай працы. Будуць створаны максімальна спрыяльныя ўмовы для самазанятасці насельніцтва.

Прадугледжваюцца ўкараненне і развіццё механізмаў інтэграцыі ў працоўную сферу мэтавых груп насельніцтва, якія маюць патрэбу ў сацыяльнай падтрымцы.

Мэтанакіраваныя захады актыўнай палітыкі на рынку працы дазволяць у ходзе структурных пераўтварэнняў эканомікі ўтрымаць афіцыйна зарэгістраванае беспрацоўе ў межах 2 працэнтаў ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва.

**Рост рэальных грашовых даходаў**

Мэтай палітыкі даходаў насельніцтва з'яўляецца павышэнне рэальнага ўзроўню ўсіх відаў грашовых даходаў.

*Меры ў галіне аплаты працы* будуць накіраваны на паслядоўнае павышэнне яе рэальнага ўзроўню, зніжэнне разрыву паміж аплатай працы работнікаў бюджэтных арганізацый і сярэдняй заработнай платай у эканоміцы.

Рэалізацыю пастаўленай задачы ў рэальным сектары эканомікі плануецца ажыццяўляць шляхам шырокага прымянення гібкіх сістэм аплаты працы, забеспячэння росту рэальнай заработнай платы, узаемазвязанага з ростам прадукцыйнасці працы.

Павышэнне заработнай платы работнікаў бюджэтных арганізацый да ўзроўню, не ніжэйшага за 80 працэнтаў ад сярэдняй заработнай платы, у эканоміцы да 2020 года прадугледжваецца забяспечыць праз аптымізацыю функцый і колькасці занятых у бюджэтнай сферы.

Памер мінімальнай велічыні, што выкарыстоўваецца пры вылічэнні ставак (акладаў, службовых акладаў) работнікаў бюджэтнай сферы, будзе паэтапна набліжацца да бюджэту пражытковага мінімуму, у перспектыве — да мінімальнага спажывецкага бюджэту.

Павышэнне сацыяльнай абароненасці работнікаў плануецца забяспечыць за кошт вызначэння штогадовага памеру мінімальнай заработнай платы на ўзроўні мінімальнага спажывецкага бюджэту ў сярэднім на аднаго члена сям'і з чатырох чалавек.

Мэтай развіцця пенсійнай сістэмы з'яўляецца забеспячэнне яе фінансавай устойлівасці і сацыяльна прымальнага ўзроўню пенсій.

Трэба будзе вырашыць наступныя задачы:

адаптацыя пенсійнай сістэмы да зменлівых эканамічных і дэмаграфічных умоў шляхам паступовага павышэння агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, аптымізацыі пенсійных выдаткаў;

падтрыманне ўзроўню пенсійнага забеспячэння, а таксама суадносін памеру сярэдняй пенсіі па ўзросце і сярэднямесячнай заработнай платы не ніжэй за 40 працэнтаў з улікам фінансавых магчымасцяў дзяржавы.

Выкананне пастаўленых задач прадугледжваецца шляхам паступовага павышэння патрабаванняў да ўзросту і стажу для прызначэння пенсіі, стымулявання працяглай легальнай працоўнай дзейнасці з выплатай абавязковых страхавых узносаў.

Плануецца далейшае развіццё добраахвотнага страхавання дадатковых пенсій у страхавых арганізацыях.

Пенсіі будуць павышацца (індэксавацца) з улікам росту сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў, бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва і фінансавых магчымасцяў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Будзе працягнутая праца па заключэнні міжнародных дагавароў для сумеснага фінансавання дзяржавамі выплаты пенсій за працу грамадзян на іх тэрыторыі.

Плануецца, што рост рэальных наяўных грашовых даходаў насельніцтва ў 2020 годзе па адносінах да 2015 года складзе 109,5-111,6 працэнта.

**Развіццё сістэмы сацыяльнай падтрымкі неабароненых катэгорый грамадзян**

Дзяржаўная палітыка ў галіне сацыяльнай абароны насельніцтва будзе нацэлена на павышэнне даступнасці і эфектыўнасці сацыяльнай дапамогі, далейшае развіццё сістэмы сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай рэабілітацыі інвалідаў.

Плануецца спрашчэнне працэдуры прадастаўлення дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі.

Развіццё сістэмы сацыяльнага абслугоўвання прадугледжваецца пры дапамозе пашырэння стацыянаразамяшчальных формаў работы, прымянення механізму дзяржаўнага сацыяльнага заказу, паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адпаведнай сферы.

Трэба будзе рэалізаваць меры па выкананні палажэнняў Канвенцыі аб правах інвалідаў і стварэнні безбар'ернага асяроддзя жыццядзейнасці інвалідаў і фізічна аслабленых асоб.

Намечаны меры па рэканструкцыі і будаўніцтве 16 аб'ектаў у стацыянарных установах сацыяльнага абслугоўвання, іх капітальным і бягучым рамонце, аснашчэнні медыцынскім, рэабілітацыйным і тэхналагічным абсталяваннем, аўтамабільным транспартам.

Плануюцца ўдасканаленне механізму матэрыяльнай падтрымкі беспрацоўных шляхам прывязкі памеру дапамогі па беспрацоўі да бюджэту пражытковага мінімуму, а таксама разгляд пытання аб укараненні ў Рэспубліцы Беларусь сістэмы страхавання ад беспрацоўя.

Асаблівая ўвага будзе нададзена ўкараненню механізмаў, накіраваных на ўзмацненне сацыяльнай падтрымкі малазабяспечаных груп насельніцтва, а таксама тых, хто мае патрэбу ў дадатковай падтрымцы, у мэтах змякчэння наступстваў павышэння тарыфаў на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі шляхам прадастаўлення безнаяўных жыллёвых субсідый.

Далейшае ўдасканаленне адраснай падтрымкі неабароненых катэгорый грамадзян дасць магчымасць захаваць узровень малазабяспечанасці насельніцтва ў сацыяльна прымальных памерах — да 5,5 працэнта ў 2020 годзе.

**Развіццё фізічнай культуры і спорту**

Дзяржаўная палітыка будзе накіравана на прыцягненне насельніцтва да рэгулярных заняткаў фізічнай культурай і спортам, захаванне ўстойлівай пазіцыі Беларусі ў ліку наймацнейшых спартыўных дзяржаў.

Працягнецца работа па ўкараненні новых формаў фізкультурна-аздараўленчай і спартыўна-масавай работы сярод усіх слаёў насельніцтва.

Прадугледжваецца далейшае ўмацаванне матэрыяльнай базы нацыянальных камандаў Рэспублікі Беларусь па відах спорту, стварэнне спецыялізаваных цэнтраў падрыхтоўкі спартсменаў.

Прадугледжана рэалізацыя комплексу мер, накіраваных на фарміраванне і забеспячэнне працы аздараўленчых груп для асоб з абмежаванымі магчымасцямі, далейшае развіццё паралімпійскага і спецыяльнага руху.

Галоўным арыенцірам развіцця фізічнай культуры і спорту стане дасягненне колькасці тых, хто займаецца фізічнай культурай і спортам, да не менш чым 25 працэнтаў ад агульнай колькасці насельніцтва ў 2020 годзе. У галіне спорту вышэйшых дасягненняў — падтрыманне спартыўнага рэйтынгу Рэспублікі Беларусь на сусветнай арэне па алімпійскіх дысцыплінах на ўзроўні, не ніжэйшым за 25-е месца штогод.

**Рост якасці і даступнасці адукацыі**

Першачарговай задачай з'яўляецца ўдасканаленне нацыянальнай сістэмы адукацыі шляхам павышэння даступнасці і якасці адукацыі ў адпаведнасці з патрэбамі інавацыйнай эканомікі, патрабаваннямі інфармацыйнага грамадства, адукацыйнымі запатрабаваннямі грамадзян.

Важным напрамкам развіцця адукацыі вызначана ўдасканаленне сістэмы бесперапыннай адукацыі ў мэтах рэалізацыі ў поўным аб'ёме прынцыпу «адукацыя праз усё жыццё».

У якасці ключавых задач вызначаны інтэграцыя сістэмы адукацыі і галін эканомікі, фундаментальнай і прыкладной навукі, падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў.

У сферы дашкольнай адукацыі акцэнт будзе зроблены на забеспячэнне найбольш поўнага задавальнення попыту сям'і на адукацыйныя паслугі, у тым ліку на платнай аснове. Прадугледжваюцца меры па пашырэнні шматфункцыянальнай сеткі дашкольных устаноў усіх формаў уласнасці, удасканаленні адукацыйнага працэсу на аснове пераемнасці дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі I ступені, а таксама павышэнні ўзроўню кваліфікацыі выхавальнікаў.

У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі прадугледжваецца правядзенне мэтанакіраванай работы па аптымізацыі сеткі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, абнаўленні зместу і вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыі. Плануецца забяспечыць установы агульнай сярэдняй адукацыі сучаснымі сродкамі навучання і вучэбным абсталяваннем, уключаючы сродкі інфарматызацыі.

Асаблівая ўвага будзе нададзена пытанням пашырэння профільнага навучання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі (X-XI класы).

Будзе ўкаранёна незалежная ацэнка якасці агульнай сярэдняй адукацыі.

Развіццё прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі плануецца накіроўваць на найбольш поўнае забеспячэнне патрэбнасцяў эканомікі ў кваліфікаваных кадрах.

Будзе забяспечана найбольш поўная інтэграцыя навучальных праграм прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі і праграм вышэйшай адукацыі.

Прадугледжваецца фарміраванне нацыянальнай сістэмы адукацыйных інфармацыйных рэсурсаў і электронных паслуг.

Неабходна стварыць эфектыўны механізм узаемадзеяння сістэмы прафесійнай адукацыі з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў.

Прадугледжваецца рэалізацыя комплексу захадаў па павышэнні канкурэнтных пераваг нацыянальнай сістэмы вышэйшай адукацыі ў міжнароднай адукацыйнай прасторы.

Плануюцца павышэнне сацыяльнага статусу педагагічных работнікаў, распрацоўка прафесійнага стандарту педагога, умацаванне кадравага патэнцыялу ўстаноў адукацыі з улікам сучасных патрабаванняў да іх адбору і падрыхтоўкі, аплаты працы.

Пільная ўвага будзе нададзена мерам па пашырэнні безбар'ернага асяроддзя ва ўстановах адукацыі для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Адным з важных напрамкаў стане развіццё інклюзіўнай адукацыі. Плануецца да 2020 года павялічыць ахоп інклюзіўнымі формамі адукацыі да 80 працэнтаў дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

**Развіццё нацыянальнай культуры і творчага патэнцыялу беларускага народа**

Развіццё нацыянальнай культуры будзе нацэлена на захаванне культурнай ідэнтычнасці беларускага народа, нацыянальных творчых традыцый, умацаванне станоўчага іміджу Беларусі ў міжнароднай культурнай супольнасці.

Для больш шырокага выкарыстання патэнцыялу беларускага культурнага ландшафту і ўключэння яго ў турыстычны абарот прадугледжваецца стварэнне сучасных цэнтраў культуры і паслуг, заснаваных на мясцовых традыцыях і гісторыка-культурных каштоўнасцях.

Трэба будзе стварыць сістэму маніторынгу стану гісторыка-культурных каштоўнасцяў на пастаяннай аснове, што дазволіць даць аб'ектыўную ацэнку мастацкім і тэхнічным асаблівасцям аб'ектаў, для ўключэння іх у дасье, якое будзе прадстаўлена ў папярэднім спісе Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА за 2016—2020 гады.

Плануецца павялічыць долю адрэстаўраваных помнікаў архітэктуры і тых, якія маюць адпаведнае функцыянальнае выкарыстанне, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь, з 15 працэнтаў у 2015 годзе да 30 працэнтаў у 2020 годзе.

Атрымае развіццё сістэма бесперапыннай мастацкай адукацыі, будзе аказвацца падтрымка таленавітай моладзі ў рэалізацыі творчых праектаў.

Намечаныя меры дадуць магчымасць пашырыць доступ да культурных даброт для розных катэгорый насельніцтва.

**Падтрымка маладога пакалення і яго прыцягненне ў стварэнне эканомікі ведаў**

Эканоміка ведаў — гэта новая, маладая эканоміка. Менавіта маладое пакаленне грамадзян Беларусі павінна сыграць вырашальную ролю ў пераходзе нашай краіны да інавацыйнага шляху развіцця. Будуць істотна пашыраны меры падтрымкі таленавітай, адоранай моладзі. Распрацавана спецыяльная сістэма грантаў, якая дазваляе вучыцца ў вядучых сусветных адукацыйных цэнтрах пры ўмове далейшай працы ў Беларусі.

Сістэма гарантыі першага працоўнага месца для выпускнікоў будзе захавана і дапоўнена мерамі садзейнічання маладзёжнай занятасці ў сферы малога і сярэдняга бізнесу.

Захаваюцца ўсе дзейныя меры падтрымкі маладой сям'і, уключаючы льготнае жыллёвае будаўніцтва.

Будзе перафарматаваны дзейны кадравы рэзерв з уключэннем у яго перспектыўных маладых кіраўнікоў.

Будуць створаны ўмовы найбольшага падатковага і фінансавага спрыяння для развіцця маладзёжнага інавацыйнага прадпрымальніцтва.

Дзяржава падтрымае студэнцкія будатрады і валанцёрскую дзейнасць у маладзёжным асяроддзі.

Асноўнымі выканаўцамі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі стануць маладзёжныя арганізацыі, уключаныя ў дзяржаўны рэестр.

Асноўны прыярытэт маладзёжнай палітыкі застанецца нязменным — выхаванне ў маладога пакалення адданасці незалежнай Беларусі і любові да роднай зямлі.

## ЦЭНТРЫ ЭКАНАМІЧНАГА РОСТУ Ў РЭГІЁНАХ

У бягучай пяцігодцы асноўныя намаганні будуць сканцэнтраваны на скарачэнні міжрэгіянальных адрозненняў ва ўзроўні і якасці жыцця насельніцтва праз развіццё сацыяльнай інфраструктуры, паступовага павышэння і выраўноўвання сацыяльных стандартаў.

За кошт канцэнтрацыі рэсурсаў на ключавых кірунках, здольных забяспечыць максімальнае развіццё тэрыторый, эфектыўнага выкарыстання мясцовага рэсурснага патэнцыялу і канкурэнтных пераваг будуць сфарміраваны *цэнтры эканамічнага росту,* дзе будуць сканцэнтраваны сучасныя вытворчыя структуры, аб'екты інжынерна-тэхнічнай і сацыяльнай інфраструктуры.

Найважнейшым напрамкам рэгіянальнай палітыкі з'яўляецца развіццё асноўных сетак і аб'ектаў энергетычнай, транспартнай, тэлекамунікацыйнай і іншай інфраструктуры ў адпаведнасці са стратэгіяй развіцця рэгіёна. Пры гэтым асаблівую ўвагу плануецца надаць прымяненню механізмаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

Развіццё інфраструктуры ва ўзаемасувязі з размяшчэннем вытворчасцяў дасць магчымасць забяспечыць развіццё тэрыторый са складаным эканамічным становішчам, скараціць разрыў ва ўзроўні і якасці жыцця насельніцтва ў гарадах розных катэгорый і сельскай мясцовасці.

У дачыненні да прадпрыемстваў, размешчаных на такіх тэрыторыях, будуць прынятыя абгрунтаваныя рашэнні аб правядзенні іх рэструктурызацыі або перапрафілявання, развіцці новых напрамкаў дзейнасці. Адначасова будуць прыняты неабходныя меры па працаўладкаванні работнікаў на новыя працоўныя месцы, якія ствараюцца на прадпрыемствах у цэнтрах эканамічнага росту.

Пры гэтым плануецца працягнуць працу па падтрымцы найбольш адсталых рэгіёнаў праз стварэнне ўмоў для стымулявання размяшчэння новых арганізацый, філіялаў і цэхаў дзейных вытворчасцяў, перш за ўсё звязаных з абслугоўваннем сельскай і лясной гаспадаркі, перапрацоўкай іх прадукцыі, выпускам вырабаў з мясцовай сыравіны, развіццём сферы паслуг для насельніцтва і турызму.

Для рэалізацыі стратэгічных напрамкаў развіцця рэгіёнаў прадугледжваюцца ключавыя праекты з прыцягненнем замежных інвестыцый і ўцягваннем у інвестыцыйны працэс свабодных вытворчых магутнасцяў, а таксама тых, якія неэфектыўна выкарыстоўваюцца.

Перспектыўнымі інструментамі прыцягнення замежных інвестыцый з'яўляюцца актывізацыя і паглыбленне міжрэгіянальных кітайска-беларускіх адносін, рэалізацыя сумесных праектаў для выкарыстання кожным з сямі рэгіёнаў не менш за 100 млн долараў у год прамых кітайскіх інвестыцый.

У сферы міжбюджэтных адносін прадугледжваецца вызначэнне на пастаяннай аснове правілаў размеркавання даходаў паміж бюджэтамі ўсіх узроўняў, а таксама ўпарадкаванне працэсу размеркавання субвенцый ва ўзаемасувязі з мэтамі дзяржаўнай палітыкі.

Працягнецца работа па развіцці тэрыторый, пацярпелых у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, уключаючы правядзенне неабходных ахоўных мерапрыемстваў, а таксама радыяцыйны маніторынг і кантроль радыеактыўнага забруджвання навакольнага асяроддзя і прадукцыі.

Ажыццяўленне запланаваных мер дасць магчымасць забяспечыць павышэнне ўзроўню жыцця і сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ва ўсіх рэгіёнах, дасягнуць станоўчых змен у структуры рэгіянальнай эканомікі, істотна павысіць узровень і эфектыўнасць выкарыстання мясцовых рэсурсаў і канкурэнтных пераваг кожнага рэгіёна.

*Праект*

# АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ на 2016—2020 гады

## «ЗЯЛЁНАЯ» ЭКАНОМІКА

Галоўнай мэтай дзяржаўнай экалагічнай палітыкі з'яўляецца стварэнне ўмоў для ўстойлівага выкарыстання прыродных рэсурсаў і зніжэння антрапагеннай нагрузкі на навакольнае асяроддзе.

Для яе дасягнення прадугледжваецца зніжэнне выкіду забруджвальных рэчываў у атмасферу і водныя аб'екты, павышэнне эфектыўнасці выкарыстання прыродных рэсурсаў, максімальнае ўцягванне адходаў у гаспадарчы абарот у якасці другаснай сыравіны са зніжэннем негатыўнага ўздзеяння аб'ектаў размяшчэння адходаў на навакольнае асяроддзе.

У мэтах захавання *біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці* плануецца аднаўленне колькасці рэдкіх відаў дзікіх жывёл і дзікарослых раслін і тых, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

У вобласці *землекарыстання* галоўны акцэнт будзе зроблены на рэалізацыю Нацыянальнага плана дзеянняў па прадухіленні дэградацыі земляў на 2016—2020 гады. Эканамічны кампанент устойлівага выкарыстання зямельных рэсурсаў дапоўніцца завяршэннем другога тура кадастравай ацэнкі зямель сельскагаспадарчага прызначэння.

Напрамкамі рацыянальнага выкарыстання і аховы *водных рэсурсаў* стануць скарачэнне забруджвальных рэчываў, якія паступаюць у водныя аб'екты са сцёкавымі водамі, укараненне прагрэсіўных энерга- і рэсурсазберагальных тэхналагічных працэсаў, а таксама ўдасканаленне механізму кампенсацыі шкоды, прычыненай водным аб'ектам.

Напрамкамі павышэння эфектыўнасці выкарыстання *мінеральных рэсурсаў* стануць укараненне сучасных тэхналогій правядзення геолагаразведачных работ, здабычы і перапрацоўкі карысных выкапняў, прыцягненне інвестыцый у геолагаразведку і горназдабыўную галіну, узнаўленне мінеральна-сыравіннай базы.

У мэтах максімальнага *ўцягнення адходаў у гаспадарчы абарот* у якасці другасных матэрыяльных рэсурсаў атрымае далейшае развіццё сістэма паасобнага збору і сартавання цвёрдых камунальных адходаў. Гэта дазволіць павялічыць аб'ём збору і перапрацоўкі другасных матэрыяльных рэсурсаў да 800 тыс. тон, стварыць перадумовы для рэалізацыі прынцыпу «нулявога» пахавання цвёрдых камунальных адходаў.

Прадугледжваецца паэтапнае ўвядзенне забароны на захаванне адходаў, якія не прайшлі сартаванне, механічную і хімічную апрацоўку.

Укараненне сучасных тэхналогій і тэхнічных сродкаў у галіне *гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя* дасць магчымасць забяспечыць патрэбы насельніцтва і дзяржаўных органаў у якасных прагнозах і абараніць грамадства і дзяржаву ад небяспечных прыродных з'яў.

Рэалізацыя гэтых кірункаў дазволіць істотна ўзмацніць экалагічны складнік сацыяльна-эканамічнага развіцця, стварыць спрыяльныя ўмовы для жыццядзейнасці чалавека, укараніць механізмы «зялёнай» эканомікі.

## БЕЛАРУСЬ-2020. ПОГЛЯД У БУДУЧЫНЮ

У пятай пяцігодцы мы спынім падзенне і вернем рост эканомікі.

Акрамя дасягнення базавых мэт (рост ВУП, рэальных даходаў, працягласці жыцця) мы зробім самае галоўнае — закладзём падмурак новай эканомікі, эканомікі ведаў і паслуг.

У краіне зменіцца прававы і інвестыцыйны клімат.

На працягу 2016 — 2017 гадоў для рэалізацыі палажэнняў пяцігадовай Праграмы будзе прынята больш за 160 нарматыўных прававых актаў. Крытэрыі ацэнкі кіруючых кадраў будуць удасканальвацца.

Беларусь стане прыцягальнай для замежнага капіталу і кампаній, якія валодаюць перадавымі тэхналогіямі.

Айчынныя прадпрымальнікі стануць галоўным рухавіком у развіцці эканомікі і стварэнні рабочых месцаў.

Сістэма кіравання будзе кампактнай, гнуткай і сучаснай.

Мы атрымаем эфектыўнага дзяржаўнага служачага; свабоднага, творчага прадпрымальніка-стваральніка; грамадства, у якім кожны чалавек будзе мець магчымасць сваёй працай зарабіць сабе на годнае жыццё і мець цвёрдую гарантыю надзейнай сацыяльнай абароны дзяржавы.

Мы пераўтворым нашу родную зямлю, робячы яе ўтульнай і квітнеючай.

Такой мы бачым Беларусь праз пяць гадоў — у 2020 годзе.

Такой яна абавязкова стане.

Усё ў нашых руках!

ДАДАТАК1

## ВЫКАНАННЕ АСНОЎНЫХ ПАКАЗЧЫКАЎ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ на 2011–2015 гады

| Найменне паказчыкаў | Заданне Праграмы | Факт | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2011 | 2012 | 2013 | 2014 | 2015 | 2011—2015 |
| ВУП,працэнтаў | 162—168 | 105,5 | 101,7 | 101,0 | 101,7 | 96,1 | 105,9 |
| Прадукцыйнасць працы па ВУП, працэнтаў | 163—168 | 105,7 | 103,5 | 101,7 | 102,3 | 97,3 | 110,8 |
| Прадукцыя прамысловасці, працэнтаў | 154—160 | 109,1 | 105,8 | 95,1 | 102,0 | 93,4 | 104,5 |
| Рэнтабельнасць продажу ў арганізацыях прамысловасці, працэнтаў | 14—15* | 12,7 | 11,3 | 7,5 | 7,6 | 8,7 | X |
| Прадукцыя сельскай гаспадаркі (у гаспадарках усіх катэгорый), працэнтаў | 139—145 | 106,6 | 106,6 | 95,8 | 102,9 | 97,1 | 108,8 |
| Рознічны тавараэварот, працэнтаў | 170—180 | 109,0 | 114,1 | 118,0 | 106,0 | 98,7 | 153,6 |
| Інвестыцыі ў асноўны капітал, працэнтаў | 190—197 | 117,9 | 88,3 | 109,3 | 94,1 | 82,5 | 88,3 |
| Экспарт тавараў і паслуг, працэнтаў | 218—222 | 158,8 | 111,5 | 84,9 | 98,3 | 75,8 | 112,1 |
| Сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі, працэнтаў да ВУП | 0,5—0,6* | -2,1 | 4,5 | -3,2 | -0,6 | 0,3 | X |
| Рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва, працэнтаў | 170—176 | 98,9 | 121,5 | 116,3 | 100,9 | 94,1 | 132,8 |
| Увод у эксплуатацыю жылля, млн. кв. метраў | 42,5—43 | 5,5 | 4,5 | 5,2 | 5,5 | 5,1 | 25,8 |

* у 2015 годзе.

ДАДАТАК 2

## АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ на 2016—2020 гады

*(у працэнтах да папярэдняга года)*

| | Факт | Прагноз | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2015 к 2010 | 2016 | 2017 | 2018 | 2019 | 2020 | 2020 к 2015 |
| ВУП | 105,9 | 100,3 | 101,5—102,1 | 102,4—103,6 | 103,3—103,9 | 104,1—104,3 | 112,1—115,0 |
| Прадукцыйнасць працы па ВУП | 110,8 | 101,5 | 101,6—102,1 | 102,2—103,2 | 103,1—103,7 | 103,8—103,8 | 112,8—115,1 |
| Індэкс спажывецкіх цэн, снежань да снежня | — | 112,0 | 109,0 | 107,0 | 106,0 | 105,0 | — |
| Прадукцыя прамысловасці | 104,5 | 100,1 | 101,2—102,2 | 102,0—103,6 | 102,5—104,0 | 103,0—104,5 | 109,1—115,2 |
| Рэнтабельнасць продажаў у арганізацыях прамысловасці, працэнтаў | — | 8,0 | 9,0 | 10,0 | 10,7 | 11,7 | — |
| Прадукцыя сельскай гаспадаркі (у гаспадарках усіх катэгорый) | 108,8 | 104,2 | 102,2—102,9 | 102,0—102,6 | 101,9—102,4 | 101,7—102,1 | 112,6—115,0 |
| Інвестыцыі ў асноўны капітал | 88,3 | 100,6 | 101,7—102,4 | 102,5—103,4 | 103,1—103,7 | 103,6—104,0 | 112,0—114,9 |
| Аб'ём будаўніча-мантажных работ | 88,7 | 97,4 | 100,4—100,5 | 101,1—101,4 | 101,5—101,8 | 102,2—102,4 | 102,6—103,5 |
| Грузаабарот | 97,4 | 100,2 | 100,9—101,0 | 101,3—102,5 | 101,8—102,6 | 102,4—102,9 | 106,8—109,5 |
| Пасажыраабарот | 102,4 | 100,4 | 100,4—100,6 | 100,5—100,7 | 100,5—100,8 | 100,6—101,0 | 102,4—103,6 |
| Экспарт тавараў і паслуг | 112,1 | 103,5 | 103,6—103,8 | 103,8—104,1 | 104,0—105,5 | 104,5—105,9 | 121,0—125,0 |
| Сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі, працэнтаў да ВУП | — | —0,3 | 0,2—0,26 | 0,4—0,5 | 0,5—0,5 | 0,5—0,65 | — |
| Рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва | 132,8 | 100,5 | 101,2—101,8 | 101,7—102,3 | 102,4—103,0 | 103,4—103,5 | 109,5—111,6 |

ДАДАТАК 3

## АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ АБЛАСЦЕЙ І г. МІНСКА на 2016—2020 гады

*(у працэнтах да папярэдняга года)*

| | Факт | Прагноз | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2015 да 2010 | 2016 | 2017 | 2018 | 2019 | 2020 | 2020 у % да 2015 |
| Валавы рэгіянальны прадукт | | | | | | | |
| Вобласці і г. Мінск | | | | | | | |
| Брэсцкая | 102,2 | 100,4 | 101,5—102,2 | 102,5—103,8 | 103,4—104,0 | 104,2—104,4 | 112,5—115,6 |
| Віцебская | 107,9 | 100,4 | 101,2—102,1 | 102,4—103,6 | 103,2—103,8 | 104,1—104,2 | 111,8—114,9 |
| Гомельская | 105,8 | 100,4 | 101,8—102,4 | 102,6—103,8 | 103,2—104,0 | 103,9—104,3 | 112,4—115,8 |
| Гродзенская | 111,4 | 101,0 | 101,2—102,0 | 102,4—103,6 | 103,4—103,8 | 104,2—104,2 | 112,8—115,4 |
| Мінская | 122,4 | 100,4 | 102,2—103,0 | 103,0—104,2 | 104,0—104,6 | 105,1—105,3 | 115,5—118,7 |
| Магілёўская | 100,1 | 100,4 | 101,6—102,3 | 102,4—103,8 | 103,4—104,0 | 104,2—104,4 | 112,5—115,8 |
| г. Мінск | 107,4 | 100,1 | 102,0—102,2 | 102,5—103,6 | 103,2—103,8 | 104,0—104,2 | 112,3—114,6 |
| Прадукцыйнасць працы па ВРП | | | | | | | |
| Вобласці і г. Мінск | | | | | | | |
| Брэсцкая | 108,6 | 101,0 | 102,2—102,8 | 102,3—103,5 | 103,6—104,1 | 103,9—104,0 | 113,7—116,3 |
| Віцебская | 118,3 | 100,5 | 102,7—103,5 | 102,5—103,5 | 103,4—103,9 | 103,9—104,1 | 113,8—116,2 |
| Гомельская | 113,9 | 100,9 | 102,7—103,2 | 102,6—103,6 | 103,1—103,8 | 103,7—103,9 | 113,7—116,4 |
| Гродзенская | 116,1 | 102,8 | 102,1—102,8 | 102,9—103,9 | 103,5—103,8 | 104,0—104,3 | 116,5—118,5 |
| Мінская | 122,2 | 102,0 | 102,3—103,0 | 102,7—103,7 | 103,8—104,3 | 104,6—104,7 | 116,4—119,0 |
| Магілёўская | 108,8 | 101,5 | 103,4—104,0 | 102,9—104,1 | 103,8—104,3 | 104,3—104,3 | 117,0—119,6 |
| г. Мінск | 108,7 | 101,9 | 99,5—99,6 | 101,6—102,5 | 102,3—102,8 | 103,0—103,1 | 108,6—110,2 |

# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — САЦЫЯЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА




### У Брэсце прайшоў абласны сход дэлегатаў V Усебеларускага народнага сходу

**На Брэстчыне абрана 350 дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. Рэгіён будуць прадстаўляць людзі самых розных прафесій, якія карыстаюцца павагай і аўтарытэтам у сваіх калектывах. На абласным сходзе дэлегаты яшчэ раз зверылі пазіцыі, абазначылі прыярытэты развіцця вобласці і сваіх рэгіёнаў. Асноўныя думкі яны афармілі ў рэзалюцыю, якую прынялі аднагалосна.**

**Старшыня аблвыканкама Анатоль ЛІС** нагадаў, якая вялікая работа была праведзена па мадэрнізацыі, рэканструкцыі і паляпшэнні галіны аховы здароўя рэгіёна. На будаўнічыя і рамонтныя работы за пяць папярэдніх гадоў было патрачана звыш 1,7 трыльёна рублёў. Акрамя таго, на перааснашчэнне і папаўненне базы медыцынскага абсталявання лячэбных устаноў пайшло больш за 280 мільярдаў рублёў. Значная дзяржаўная падтрымка накіравана на паляпшэнне якасці медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. Сёння можна падводзіць пэўныя вынікі названай работы. Яны найперш у тым, што назіраецца натуральны прырост насельніцтва. На 1 чэрвеня ён склаў па вобласці 198 чалавек.

Сацыяльная палітыка заўсёды была прыярытэтам нашай дзяржавы. Апошняе можна праілюстраваць і на прыкладзе развіцця аб'ектаў адукацыі вобласці. На іх будаўніцтва патрачана за апошнія пяць гадоў 990 мільярдаў рублёў. Уведзены ў эксплуатацыю 10 школ, 17 дашкольных устаноў. Замест закрытых школ-інтэрнатаў пабудаваныя 24 дамы для сем'яў, якія ўзялі на выхаванне дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў. На наступную пяцігодку ў вобласці плануецца пабудаваць восем дзіцячых садкоў на дзве тысячы месцаў.

Кіраўнік вобласці адзначыў, што асноўнай задачай сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступныя пяць гадоў стане далейшае павышэнне дабрабыту насельніцтва, вырашэнне актуальных пытанняў жыццядзейнасці людзей, забеспячэнне поўнай занятасці, стварэнне ўмоў для росту заработнай платы праз павышэнне эфектыўнасці гаспадарання. Былі агучаны праграмныя лічбы для Брэстчыны. Так, за пяць гадоў плануецца павялічыць рэальную заработную плату на 13,5 працэнта, намінальныя выплаты — ў 1,7 раза, прадукцыйнасць працы пры гэтым павінна ўзрасці на 16,6 працэнта.

Перад удзельнікамі сходу выступіў **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы па Брэсцкай вобласці Міхаіл МЯСНІКОВІЧ**. Свaім бачаннем перспектыў развіцця падзяліліся дэлегаты, якія з'яўляюцца кіраўнікамі ўстаноў і арганізацый рэгіёна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ПАТЭНЦЫЯЛ ЁСЦЬ. ЯГО ТРЭБА ЗАДЗЕЙНІЧАЦЬ

### Якія пытанні дэлегаты вынесуць на абмеркаванне V Усебеларускага народнага сходу?

**Сяргей НАВІЦКІ,** ***генеральны дырэктар сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Хенкель Баўтэхнік», г. Заслаўе:***



— За апошнія пяць гадоў у Мінскай вобласці колькасць арганізацый малога і сярэдняга бізнесу вырасла амаль на 25%: з 45,5 да 57 тысяч, паступленні ў бюджэт ад іх павялічыліся ў пяць разоў — з 1,8 да 8,7 трлн рублёў.

На Міншчыне 70% малых і сярэдніх прадпрыемстваў, індывідуальных прадпрымальнікаў ажыццяўляюць дзейнасць у сферы аказання паслуг і гандлю. У прамысловай вытворчасці — толькі 10% суб'ектаў. Патэнцыял прыватнага прадпрымальніцтва сёння задзейнічаны не ў поўнай меры. Ва ўмовах глабальнай канкурэнцыі складана разлічваць, што нашы малыя і нават сярэднія суб'екты гаспадарання змогуць самастойна прарвацца на пераапоўненыя знешнія рынкі. Ва ўсім свеце невялікія прадпрыемствы-экспарцёры інтэгруюцца ў вытворчыя ланцужкі з буйнымі нацыянальнымі і транснацыянальнымі карпарацыямі. Такім шляхам павінна рухацца і Беларусь. Для таго, каб падняць эканоміку краіны, трэба стымуляваць малы бізнес, зняць з прыватнікаў адміністрацыйны ціск і даць прадпрымальнікам магчымасць самарэгуляцыі сваёй работы. Дзяржава павінна весці дыялог з бізнесам нароўні, а не размаўляць з ім, як з малодшым братам.

**Павел НАЙДЗЁН,** ***старшыня Слаўгарадскага райвыканкама:***



— Для Слаўгарадскага раёна Указ Прэзідэнта аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці — знакавы дакумент, дзе выразна распісана, што і як рабіць. Як дамагчыся аддачы ад капіталаўкладанняў, ад мадэрнізацыі прадпрыемстваў, ад кожнага гектара зямлі. Галоўным рэзервам будзе зніжэнне выдаткаў і прыцягненне інвестыцый.

Мы вызначылі ў эканоміцы раёна 3 асноўныя напрамкі, па якіх будзем працаваць у бліжэйшыя гады, а менавіта развіццё сельскай гаспадаркі, развіццё і стымуляванне малога і сярэдняга бізнесу, актывізацыя турыстычнай сферы. Гэта дасць магчымасць ствараць новыя прадпрыемствы, павялічваць колькасць зноў створаных працоўных месцаў. Апошнія 5 гадоў у раёне паспяхова рэалізоўваліся мерапрыемствы па дасягненні важных параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця. Значную ролю ў развіцці сыграла Дзяржаўная праграма па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы. За апошнія 5 гадоў на яе рэалізацыю з рэспубліканскага бюджэту было выдзелена каля 330 мільярдаў рублёў.

Умацаванню эканомікі і забяспечанасці занятасці насельніцтва садзейнічае развіццё малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Дзейнасць асноўных прадпрыемстваў бізнесу на Слаўгарадчыне звязана з мясцовай сыравінай. На 8 дзеючых прадпрыемствах, якія займаюцца апрацоўкай драўніны, адбылося пашырэнне вытворчасці. За перыяд дзеяння Указа №235 у раёне створана 3 прыватныя прадпрыемствы — па аказанні турыстычных паслуг, па вытворчасці мясных прадуктаў, па вырошчванні і апрацоўцы бульбы, зарэгістравана 3 сялянска-фермерскія гаспадаркі, 29 індывідуальных прадпрымальнікаў (8 з іх — жыхары сельскай мясцовасці). Удзельная вага суб'ектаў малога прадпрымальніцтва ў агульным аб'ёме экспарту раёна складае 84%. Намі распрацавана праграма па развіцці турызму, рэалізацыя якой дазваляе падтрымліваць ініцыятывы мясцовых жыхароў і арганізацый, накіраваныя на развіццё сельскага і экалагічнага турызму. Дзеля гэтых мэт працуе 12 аграсядзіб, больш за 20 сыравараў і 15 рамеснікаў. Мы актыўна падтрымліваем ініцыятывы грамадзян па самазанятасці, вядзенні асабістых падсобных гаспадарак. Ёсць прыклады, калі жыхары ўтрымліваюць ад 5 да 20 кароў, да 100 галоў хатняй птушкі.

Раён прывабны не толькі для інвестараў і турыстаў, але і маладых спецыялістаў, якіх за 3 гады прыбыло 198 чалавек (80% — замацавалася на фермах!). І гэта не толькі мясцовыя, а і жыхары іншых раёнаў. Асаблівая ўвага надаецца жыллёваму будаўніцтву, за 5 гадоў уведзена ў эксплуатацыю больш за 13 тысяч квадратных метраў жылля. І колькасць сямей, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, павялічваецца. Гэтаму вельмі садзейнічае льготнае крэдытаванне. Дзяржпраграма дэмаграфічнай бяспекі і жыллёвая палітыка паказалі сваю выніковасць.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,**
**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ З нагоды

# «ТРАПІЦЬ НА ДОШКУ ГОНАРУ ПРАСЦЕЙ, ЧЫМ ТАМ УТРЫМАЦЦА»




**Міхаіл БАТУРА, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, доктар тэхнічных навук, прафесар:**

— На Рэспубліканскую дошку гонару мы трапілі як арганізацыя, якая ажыццяўляе навуковыя даследаванні і распрацоўкі. Лічу гэта найвышэйшай ацэнкай эфектыўнасці і актуальнасці для эканомікі краіны навукова-даследчай работы, што праводзіцца нашымі вучонымі. Ва ўніверсітэце сёння працуюць 50 навукова-даследчых лабараторый і даследчых груп, цэнтр «Нанаэлектроніка і новыя матэрыялы», Цэнтр трансферу тэхналогій у галіне радыёэлектронікі... Пастановай урада БДУІР вызначаны ў якасці галаўной арганізацыі ў краіне па даследаванні праблем абароны ад непрадбачаных перашкод і забеспячэння электрамагнітнай сумяшчальнасці радыёэлектронных сродкаў.

Штогод выконваецца больш як 350 навуковых тэм па заданнях дзяржпраграм, Фонду фундаментальных даследаванняў, Міністэрства адукацыі і ў рамках гаспадарчых дагавораў з прамысловымі прадпрыемствамі і арганізацыямі. Навукаёмістыя і высокатэхналагічныя распрацоўкі ўніверсітэта шырока выкарыстоўваюцца айчыннымі прадпрыемствамі і экспартуюцца за межы рэспублікі.

Пацвярджэннем арыгінальнасці і навізны ўзораў новай тэхнікі і тэхналогій, створаных вучонымі ўніверсітэта, з'яўляецца атрыманне імі каля 3 тысяч аўтарскіх пасведчанняў і патэнтаў, а таксама медалёў і дыпломаў на прэстыжных міжнародных выставах у Германіі Польшчы, Егіпце, Расіі і краінах Балтыі.

У нас вельмі развіта супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі. Сёння мы выконваем работы па 64 замежных кантрактах на агульную суму 16,8 млн долараў. Прыцягваем валюту ў краіну. Ды і сваім навукоўцам даём магчымасць ніядрэнна зарабляць. Вельмі паспяхова працуем з Кітайскай Народнай Рэспублікай па стварэнні радарных установак і прылад. Восенню плануецца падпісанне яшчэ аднаго кантракта з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі. Тэма — павышэнне эфектыўнасці і тэрмінаў эксплуатацыі сонечных батарэй.

Увогуле, хачу дадаць, што знаходзіцца сярод лепшых не толькі ганарова, але і вельмі адказна. Тым больш што нашы дасягненні з занясеннем На Рэспубліканскую дошку гонару прызнаюцца ўжо трэці раз, але штогод ацэнены заслугі навукоўцаў БДУІР за ўсю пяцігодку. Мяркую, што трапіць на Дошку гонару першы раз прасцей, чым там утрымацца, бо трэба працаваць яшчэ больш інтэнсіўна. І той факт, што нам гэта пакуль удаецца, сведчыць пра пэўную стабільнасць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# НАЛЕЖНЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ПАКУПНІКОЎ

**Аляксей СОКАЛ,** ***першы намеснік генеральнага дырэктара акцыянернага таварыства «ЦУМ Мінск»:***

— Для работнікаў нашага прадпрыемства стала радасцю навіна падпісання кіраўніком дзяржавы Указа №225 «Аб занясенні на Рэспубліканскую дошку гонару пераможцаў спаборніцтваў за дасягненне ў 2015 годзе найлепшых паказчыкаў». Прыемна, што менавіта наша прадпрыемства было адзначана ў сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця сярод іншых гандлёвых кампаній. Для калектыву ЦУМа такая ўзнагарода стала сапраўдным гонарам, станоўчай ацэнкай працы не толькі за год, але і за мінулыя 5 гадоў. Мы ўдзячны, што сярод усёй гандлёвай галіны краіны дзяржава вылучыла менавіта наша сціплае прадпрыемства.

Калі казаць пра дасягненні ЦУМа ў 2015 годзе, то адзначу тэмп росту ў супастаўных цэнах па рознічным тавараабароце, які склаў 105,4%. Удзельная вага рэалізацыі тавараў айчыннай вытворчасці перавысіла за мінулы год 75%, а па харчовым напрамку гэты паказчык дасягнуў 94%. Каб выйсці на такі ўзровень, на працягу апошняй пяцігодкі на прадпрыемстве штогод паспяхова рэалізоўваліся распрацаваныя спецыялістамі бізнес-планы развіцця.

Сярод апошніх перспектыўных праектаў варта адзначыць рэканструкцыю і ўвядзенне ў 2014 годзе ў эксплуатацыю каля 1300 квадратных метраў гандлёвых плошчаў комплексу «Дзіцячы свет». Летась таварыствам было ўкладзена каля 9 млрд рублёў інвестыцый, за кошт якіх праведзена мадэрнізацыя і змена тэхналогіі і метадаў продажу на пятым паверсе гандлёвай залы. Да гэтага былі цалкам пераабсталяваны памяшканні і зменены метады абслугоўвання ў нашых філіялах «Тавары для жанчын» і «Камароўскі».

Ужо сёлета ў развіццё прадпрыемства было ўкладзена яшчэ каля 4 млрд рублёў інвестыцый, з якіх 2,5 млрд рублёў накіравана для стварэння дадатковых 500 квадратных метраў комплексу «Дзіцячы свет». А гэта дасць станоўчы эфект не толькі сёлета, але і стане падмуркам на наступныя гады. Таксама завяршаем экспертызу па праектных работах аб перапрафіляванні памяшканняў пад гандлёвыя плошчы, што дазволіць дадаткова ўвесці ў эксплуатацыю каля 300 гандлёвых «квадратаў». Усе гэтыя дзеянні дапамагаюць ствараць належныя ўмовы для пакупнікоў, падтрымліваць сапраўды шырокі асартымент тавараў, дзе большы ўпор робіцца на групу айчыннай вытворчасці. Паляпшаем выкладку тавараў, доступ іх да пакупнікоў, паляпшаем іншыя ўмовы для кліентаў, каб ім было яшчэ зручней ажыццяўляць пакупкі менавіта ў нас.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

## НА СУВЯЗІ — КІРАЎНІКІ РЭГІЁНАЎ

**Усе пытанні, з якімі звернуцца людзі, будуць вырашацца аператыўна**

18 чэрвеня ў абласцях і сталіцы будуць праведзены прамыя тэлефонныя лініі з удзелам старшынь абл-, гар- і райвыканкамаў, кіраўнікоў адміністрацый раёнаў у гарадах. Звяртацца неабходна па тэлефонах:

Брэсцкі аблвыканкам 80162213121
Віцебскі аблвыканкам 80212222222
Гомельскі аблвыканкам 80232751237
Гродзенскі аблвыканкам 80152735644
Магілёўскі аблвыканкам 80222501869
Мінскі аблвыканкам (8017) 5004160
Мінскі гарвыканкам (8017) 222 44 44

У абласных студыях разам з кіраўніцтвам рэгіёнаў будуць працаваць спецыялісты жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аховы здароўя, адукацыі, сацыяльнай абароны, юрысты, дарожнікі, спецыялісты землеўладкавання, іншых службаў, каб аператыўна вырашаць тыя пытанні і праблемы, з якімі людзі будуць звяртацца падчас «прамых ліній».

■ Не абмініце

## БЫКАЎ. ШЛЯХ ДАДОМУ

**Літаратурна-дакументальная выстаўка, прысвечаная Васілю Быкаву, адкрыецца ў панядзелак, 20 чэрвеня, у Міністэрстве замежных спраў Беларусі.**

Праект мае сімвалічную назву «Васіль Быкаў. Доўгая дарога дадому...», ён створаны па матывах аўтабіяграфіі пісьменніка — яго апошняй прыжыццёвай кнігі.

Гэтая выстаўка — сумесны праект міністэрства і Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, яе адкрыццё будзе прымеркавана да 75-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Плануецца, што на ўрачыстай цырымоніі будуць прысутнічаць кіраўнікі і прадстаўнікі дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Беларусі, у ёй прыме ўдзел намеснік міністра замежных спраў Алена Купчына.

Як расказаў БЕЛТА прэс-сакратар міністэрства Дзмітрый МіронЧык, аўтарамі фотаздымкаў, прадстаўленых на выстаўцы, з'яўляюцца розныя людзі. Гэта малодшы сын пісьменніка Васіль Быкаў, гісторык мастацтва, намеснік дырэктара Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Валерый Шышанаў, саветнік пасольства Беларусі ў Германіі Аляксей Жбанаў і першы сакратар пасольства ў Чэхіі Андрэй Кухарчык. У экспазіцыі таксама будуць прадстаўлены дакументы, рукапісы, кнігі і малюнкі Васіля Быкава з фондаў музея гісторыі беларускай літаратуры і асабістага архіва пісьменніка.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ Надвор'е

## СПЯКОТА, ДОЖДЖ І НАВАТ ГРАД

### А на наступным тыдні месцамі прыпячэ да плюс 34 градусаў

**На гэтым тыдні тэрыторыя нашай краіны трапіла пад уплыў хвалі цёплага паветра з боку Міжземнага мора, паведамляюць спецыялісты Белгідраметэацэнтра. Стала ўжо не проста цёпленька, нават на фоне дажджоў сіноптыкі і далей прагназуюць анамальную спякоту.**

Таму і ў пятніцу прыток паўднёвага цяпла толькі ўзмоцніца. І гаспадарыць у нас сёння будуць атмасферныя франты ад цыклону з цэнтрам над Калінінградскай вобласцю. Удзень пераважна па заходняй палове рэспублікі пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі магчымыя навальніцы і часам град. У другой палове дня на большай частцы тэрыторыі прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 метраў у секунду. Максімальная тэмпература паветра складзе плюс 24—29 градусаў, а па паўднёвым захадзе краіны — да 30—33 цэлпа.

У суботу мы трапім пад уплыў паўднёвай ускраіны цыклону, які рухаецца ад нас у бок Фінляндыі. Пад уплывам франтальных раздзелаў уначы на большай частцы краіны, а ў суботу ўдзень месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Удзень на паўднёвым усходзе магчымы град. Месцамі ўзмоцніцца вецер парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 13 да 18 градусаў, удзень — 22—28 цяпла. На паўднёвым усходзе ўвогуле ўсталюецца трапічнае надвор'е, калі тэмпература паветра ўначы не будзе ніжэй за плюс 19—22 градусы, а ўдзень тэмпературны фон пачне дасягаць 29—30 цяпла.

У нядзелю надвор'е супакоіцца, бо на тэрыторыі краіны будзе "стаяць" зона павышанага атмасфернага ціску. Толькі на паўднёвым усходзе адаб'ецца ўплыў маларухомага атмасфернага фронту. Прагназуецца пераменная воблачнасць і, пераважна па паўднёвым усходзе краіны, пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Аднак удзень месцамі яшчэ магчымы град. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе 10—17 градусаў цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 19 градусаў. Удзень прагназуецца 24—30 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак на тэрыторыю Беларусі завітае атмасферны фронт і цёплыя паветраныя масы, якія паступаюць да нас з боку поўдня Еўропы. Таму ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Уначы будзе ўжо плюс 13—20 градусаў, а ўдзень паветра прагрэецца да 23—29 цяпла, на поўдні — да плюс 30—33 градусаў.

Самая моцная гарачыня на старце лета прагназуецца спецыялістамі ў аўторак і сераду. У гэтыя дні тэрыторыя краіны застанецца пад уплывам вельмі цёплых, але няўстойлівых паветраных мас міжземнаморскага паходжання. Праўда, месцамі магчымы кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 14 градусаў да 21 цяпла, удзень тэмпературны фон паветра падымецца да плюс 24—30 градусаў, а на поўдні краіны будзе ўжо і да 31—34 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**
kurkach@zviazda.by

■ Не жадаеце далучыцца?

## ГАЙДА КРУЦІЦЬ ПЕДАЛІ!

### Веласіпед можна ўзяць у бясплатным пракаце

17 чэрвеня ў сталіцы афіцыйна адкрываецца другі сезон валанцёрскага праекта «Добры ровар». У гэты дзень стартуе рэгістрацыя будучых карыстальнікаў бясплатнага велапракату.

Каб стаць удзельнікам праекта, неабходна быць паўналетнім і мець пры сабе пашпарт. Сама сістэма пракату абсалютна аўтаматычная: скарыстацца ім можна праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце dobrovar.by, там жа ёсць магчымасць забраніраваць веласіпед, даведацца код і забраць яго з адной з 12-ці парковак у цэнтры Мінска. Па заканчэнні 12-ці гадзін веласіпед неабходна будзе вярнуць на любую з прапанаваных паркованак, замацаваўшы яго кодавым замком. Пасля гэтага двухкалёсны машынай можа скарыстацца іншы чалавек.



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ

Мэтай праекта з'яўляецца стварэнне бясплатнага веласіпеднага пракату ў Мінску. «Добры ровар» скіраваны на тое, каб забяспечыць даступнасць веласіпеда як гарадскога транспарту для штодзённых паездак для насельніцтва, а таксама прадставіць яго перавагі для прыроды і здароўя. Сёлета бясплатны пракат будзе працаваць да кастрычніка.

«У мінулым годзе ён быў даволі папулярны: ім скарысталіся 2,6 тысячы чалавек. Гэта даказвае запатрабаванасць выкарыстання ровара ў якасці транспарту ў межах Мінска», — кажуць арганізатары. — Ды і горад дазваляе рабіць гэта беспеарашкодна: дзякуючы плоскаму рэльефу і шырокім тратуарам Мінск — ідэальнае месца для развіцця веласіпеднага руху».

Каманда праекта не абмяжоўваецца арганізацыяй бясплатнага веласіпеднага пракату: будуць праводзіцца акцыі, майстар-класы з мэтай прыцягнення ўвагі жыхароў і гасцей сталіцы да культуры веласіпеднага руху, яго перспектыў і праблем.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## МАТЧ ЖАНОЧАЙ ЗБОРНАЙ ПА БАСКЕТБОЛЕ ПАКАЖУЦЬ У ЖЫВЫМ ЭФІРЫ

**У праграме перадач тэлеканалаў «Беларусь 2» і «Беларусь 5» адбылібся змены.**

Як паведамляе прэс-служба Белтэлерадыёкампаніі, паядынак жаночай алімпійскай кваліфікацыі па баскетболе Беларусь — Кітай пакажуць у прамым эфіры на канале «Беларусь 5». Трансляцыя пачнецца ў 18:55. Такім чынам, прайшла замена эфіраў матчаў групавой стадыі першынства Еўропы па футболе. Сустрэчу Італія — Швецыя ў 16:00 можна будзе паглядзець на «Беларусь 5», а эфір гульні Чэхія — Харватыя ў 19:00 зойме месца ў сетцы вяшчання канала «Беларусь 2».

**Тарас ШЧЫРЫ.**

## АЎТОБУС ДЛЯ ВАНДРОВАК

**На аўтазборачнай вытворчасці «Нёман» у Лідзе распачалі вырабляць навінку — турыстычны аўтобус.**

28-месны аўтобус маркі «Нёман 420224-11» аснашчаны дызельным чатырохцыліндравым рухавіком аб'ёмам 3 літры і магутнасцю 146 конскіх сіл, мае вялікія багажныя аддзяленні, сядзенні класа люкс, таніраваныя шклопакеты, кандыцыянеры, аўдыявідэасістэму і іншыя выгоды для турыстычных падарожжаў. Важна і тое, што ён адпавядае экалагічнаму класу EURO-5. На прадпрыемстве спадзяюцца, што новы аўтобус будзе запатрабаваны не толькі на беларускім рынку, але і ў замежжы. У прыватнасці, ён прыцягнуў увагу замежных партнёраў на нядаўняй выстаўцы ў рамках XII беларуска-літоўскага эканамічнага форуму.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ДЗІЦЯЦІ НЕ ПЕРАДАЕЦЦА

**Сусветная арганізацыя аховы здароўя засведчыла, што наша краіна дасягнула поўнага прадухілення перадачы ад маці дзіцяці ВІЧ-інфекцыі і сіфілісу.**

Беларусь стала першай і адзінай дзяржавай у Еўропе, дзе ўдалося скараціць перадачу гэтых небяспечных інфекцый да ўзроўню, які не ўяўляе пагрозы для грамадскага здароўя.

Ліквідацыя перадачы ВІЧ і сіфілісу ад маці дзіцяці мае важнае значэнне для глабальных намаганняў па барацьбе з інфекцыямі, якія перадаюцца палавым шляхам, і ліквідацыі СНІДу да 2030 года. У папярэднія гады СААЗ і партнёры распрацавалі крытэрыі пацвярджэння ліквідацыі абедзвюх інфекцый. Летась Куба стала першай, хто атрымаў пацвярджэнне паспяховай ліквідацыі перадачы ВІЧ і сіфілісу ад маці дзіцяці. Сёння СААЗ віншуе Арменію, Беларусь, Малдову і Тайланд, якія прыкладалі вялікія намаганні, каб забяспечыць даступнасць на раннім этапе даронавай дапамогі, тэсціраванне на ВІЧ і сіфіліс усіх цяжарных і іх партнёраў, лячэнне для жанчын і іх дзяцей з пацверджанымі вынікамі тэсціравання на ВІЧ.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ВЕЗЛІ МАК БУЙНЫМІ ПАРТЫЯМІ

**Супрацоўнікі сталічнага наркакантролю пры падтрымцы байцоў спецпадраздзялення «Алмаз» затрымалі двух жыхароў Мінска, якія перавозілі ў машыне амаль тону маку.**

Раней мы паведамлялі, што нядаўна ў гаражы па вуліцы Будслаўскай аператыўнікі выявілі каля 800 кілаграмаў насення маку. Высветлілася, што ён таксама належаў затрыманым. Гаспадарову тавару — 30-гадовага індывідуальнага прадпрымальніка і 27-гадовага тэхніка па рамонце адной са сталічных СТА — «перахапілі» на аўтадарозе Мінск—Слуцк—Мікашэвічы.

Па інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, у «Мерседэсе» перавозіліся 48 палімерных мяхоў з насеннем маку агульнай вагой каля тоны. Згодна з заключэннем экспертызы, у насенні ўтрымлівалася прымесь небяспечнага наркатычнага сродку — макавай саломкі.

Затрыманыя аказаліся аптавікамі — прывезены з Украіны тавар прадавалі ў Мінску дробнымі партыямі. Кілаграм насення каштуе на «чорным рынку» больш за мільён рублёў. Заведзена крымінальная справа.

## СТАНЦАВАЛА НА... ТАКСІ

**У сталіцы за хуліганскія паводзіны затрымалі мінчанку 1997 года нараджэння, якая нападпітку танцавала на... капоце таксі, прыпаркаванага каля начнога клуба.**

— Высветлілася, што вечарам дзяўчына была са сваёй сяброўкай у гасцях, дзе не абышлося без спіртнога. Пасля яны вырашылі выправіцца ў начны клуб. Пад'ехаўшы да яго, дзяўчына залезла на капот аўтамабіля таксі «Сітраен» і пачала танцаваць, — паведаміла падрабязнасці здарэння прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна Абозная. — У выніку на капоце ўтварыліся ўвагнутасці. А хуліганка тым часам перабралася ўжо на дах машыны. Дзяўчыну затрымалі відавочцы здарэння і перадалі яе супрацоўнікам міліцыі. Затрыманая нідзе не працуе і не вучыцца. Свой учынак патлумачыла ўздзеяннем алкаголю. Заведзена крымінальная справа, хуліганцы пагражаюць або грамадскія работы, або штраф, або папраўчыя работы на тэрмін да двух гадоў, або арышт на тэрмін да шасці месяцаў, або пазбаўленне волі на тэрмін да трох гадоў.

## ПАПРАСІЛІ ВАДЫ І ВЫНЕСЛІ ВАЛЮТУ

**Пенсіянерка з вёскі Ходасы Камянецкага раёна пазбавілася 11 тысяч долараў пасля таго, як у яе дом завіталі тры незнаёмыя жанчыны.**

Напачатку тыя папрасілі вады, а потым разгарнулі перад 83-гадовай гаспадыняй свой тавар на продаж — хусткі, ручнікі, пледы. Відавочна, што гэтыя рэчы яны скарысталіся для таго, каб адцягнуць увагу пенсіянеркі.

Пад прыкрыццём хаўрусніц адна са зламысніц трапіла ў суседні пакой, дзе ў шафе з пасцельнай бялізнай адшукала валюту і скрала яе. Прапажу гаспадыня дома заўважыла толькі на наступны дзень пасля візіту незнаёмак.

Вяскоўцы сцвярджаюць, што напярэдадні гэтага здарэння бачылі цёмны аўтамабіль з рэгістрацыйнымі нумарамі Гомельскай вобласці, які раз'язджаў па вуліцах. Асобы махляра цяпер устанаўліваюцца. Як распавёў начальнік крымінальнага вышуку Камянецкага РАУС Ігар Франковіч, з пачатку года гэта першы падобны выпадак у раёне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# САЛДАТЫ ЛЯСНОГА ФРОНТУ

## Славуты камбрыг захаваў практычна ўвесь архіў партызанскай брыгады

**Сёлета ў пачатку красавіка споўнілася б 102 гады з дня нараджэння арганізатара партызанскага руху на Віцебшчыне, камандзіра партызанскай брыгады імя Чырванасцяжнага Ленінскага камсамола, ганаровага грамадзяніна горада Віцебска Данілы Фядотавіча Райцава. Славуты камбрыг, будучы ўпэўненым, што гэта спатрэбіцца нашчадкам, захаваў практычна ўвесь архіў сваёй партызанскай брыгады. Пасля смерці Данілы Фядотавіча ў чэрвені 1996 года яго ўдава Вольга Міхайлаўна перадала дакументы ў абласны музей імя М.П. Шмырова. Паводле гэтых дакументаў мы падрыхтавалі да друку ўспаміны партызанскага камандзіра.**



Д.Ф. Райцаў у 1950-я гады.

...Кажуць, каб добра пазнаць чалавека, трэба з ім пуд солі з'есці. Я з многімі суражанамі на працягу ўсяго свайго жыцця еў хлеб-соль, дзяліўся думкамі. І цяпер, калі настаў ліхі час, было няцяжка вызначыць тыя «душэўныя маршруты», якія выбіралі мае землякі. Добрае веданне людзей давала падставу беспамылкова вызначыць: адных — у партызаны, другіх — засілаць у варожы стан, трэціх — пакідаць сувязнымі.

Рады лясных салдат няспынна раслі, папаўняліся новымі байцамі. У душах людзей, як у кроплі расы, адлюстроўваліся патрыятычныя адносіны да Радзімы ў час цяжкіх выпрабаванняў.

Тут я крыху парушу ход успамінаў, каб вылучыць, акрэсліць характары асобных народных мсціўцаў, іх шлях да нас.

**Потым яна стане знатнай «сумяшчальніцай»: адначасова і медыцынскай сястрой, і аўтаматчыцай, і падносчыцай двухпудовых порцый толу да чыгуначнага палатна, і разведчыцай.**

**Іван Гваздзёў**. Курынскі камсамолец. Сярод вясковай моладзі вылучаўся сваімі штукарствамі. Многа чытаў аб подзвігах герояў грамадзянскай вайны і першых пяцігодак, дзяліўся прачытаным з равеснікамі. Моцна сябраваў з камсамольцам Міхаілам Сільніцкім. Марыў стаць пагранічнікам і пільна ахоўваць свяшчэнныя рубяжы Радзімы.

А пакуль што ён у мяне на прыкмеце: дзяліць яму з намі партызанскую долю.

Калі я ішоў да айчыма Гваздзёва. Яўхіма Фёдаравіча Клімовіча, убачыў расклееныя на вуліцах нямецкія аб'явы: «Хто паведаміць, дзе хаваецца Райцаў Д.Ф. (гэта значыць я), той атрымае ўзнагароду ў суме 50 тысяч рублёў». Але я не шукаў прытулку ў той хаце, а хацеў як мага хутчэй далучыць да Клімовіча ягонага пасынка. Прынёс некалькі лістовак з паведамленнямі Савецкага інфармбюро, аддаў іх Івану.

— Гебельс і ўся яго прапаганда, — тлумачу, — вылузваюцца са скуры, надрываюцца ў хлусні. Трэба, каб нашы людзі ведалі праўду аб становішчы на франтах, аб геразме Чырвонай Арміі і ўсяго савецкага народа. Ідзі, Ваня, да людзей, расказвай ім нашу праўду. Гартуй і рыхтуй да партызанскіх баёў моладзь.

Маладыя патрыёты збіралі зброю. Кралі аўтаматы і ў самых гітлераўцаў, асабліва ў час налётаў нашай авіяцыі. У вёсцы Андронавічы ў дамах, дзе жылі камсамольцы Пётр Зязюлькін і Васіль Салаўянаў, разлегліся нанач нямецкія салдаты. Спалі моцна. Пётр і Васіль, не губляючы часу, забралі зброю, гранаты і патроны, пераапрануліся ў нямецкую форму і пад покрывам ночы прыйшлі ў партызанскі атрад. Потым яны былі добрымі разведчыкамі і мінёрамі.

Наш партызанскі пароль прывёў у лес не адну групу юных мсціўцаў. Тыя, што прыходзілі са зброяй у руках, папаўнялі атрад і накіроўваліся на баявыя заданні, а шлях астатніх ляжаў за лінію фронту, у рады Чырвонай Арміі.

Сам Іван Гваздзёў потым стане ў адзін рад з самымі кемлівымі і адважнымі. Будзе пасланы ў Маскву, сустрэнецца з першым сакратаром ЦК ВЛКСМ М.А. Міхайлавым, раскажа карэспандэнтам савецкага друку і радыё аб подзвігах беларускіх партызанаў, паступіць у спецшколу. Начальнік яе пастараецца, каб юныя мсціўцы як мага хутчэй авалодалі падрыўной справай і вярнуліся ў тыл ворага. І паляцяць пад адхон эшалоны з жывой сілай і ваеннай тэхнікай праціўніка.

**Вольга Сонава**. Камсамолка з вёскі Стырыкі. Да вайны хадзіла ў школу; як і яе сяброўкі, марыла аб тых невядомых шляхах, якія ад суседняга шклозавода вялі ў гарады, дзе былі інстытуты, студыі, спартыўныя залы. А цяпер усе гэтыя шляхі-дарогі перабльтала вайна, і выйсце з вогненнага лабірынту Вольга бачыла толькі ў разгроме фашызму. Калі наш атрад прыбыў у Стырыкі, камсамолка адразу ж завітала да мяне і заявіла:

— Прыміце мяне ў атрад. Хачу помсціць лютаму ворагу. Дзеля роднай Бацькаўшчыны не пашкадую нічога, нават жыцця.

— Добраахвотнік — не нявольнік, кожнаму вядома. Прымем у атрад, — адказваю Сонавай. — Толькі якую прыдумаць табе спецыяльнасць?

— Я прыдумала ўжо! — узрадавалася Вольга становачу рашэнню. — Я ж скончыла курсы медыцынскіх сясцёр... І практыку прайшла...

— Нам такія патрэбны ўжо сёння...

— І фашыстаў буду біць нароўні з вамі, — рашуча дадала камсамолка.

Яна пойдзе з намі цярністымі дарогамі. Яе не спалохаюць доўгія і далёкія пераходы. Будзе смелай і мужнай у баях з ворагам. Калі хто з нашых натыкнецца на варожую міну, будзе паранены, яму акажа дапамогу «партызанская сястрычка». Потым яна стане знатнай «сумяшчальніцай»: адначасова і медыцынскай сястрой, і аўтаматчыцай, і падносчыцай двухпудовых порцый толу да чыгуначнага палатна, і разведчыцай. І гэта цудоўнае маладое жыццё абарвецца ў высокім чароце разам з абозам раненых партызанаў, з якім па-зверску расправіліся фашысцкія карнікі...

**Федзя Клімовіч**. Зусім юны курынскі піянер... Як казаў паэт, ён «больш не падрос да ад бацькавых калёс...»

А той Федзя, ростам мне па пояс, стаіць па ўсёй вайсковай выпраўцы, чаканіць:

— За кроў, за слёзы, за пажары я ім, фашысцкім гадзінам, горлы перагрызу!

Можна падумаць, што гэты хлапчук не Федзя — вясковы, басаногі, — а казачны Вярнігара.

— Я, дзядзька Даніла, падрыхтаваўся стаць сапраўдным партызанам, — працягваў піянер ужо з «вольнай нагі» і глядзеў мне ў твар сваімі вачыма-васількамі. — Няхай камсамольцы пацвердзяць: я зброю, патроны, гранаты збіраў, ужо шмат фашыстам нашкодзіў. Ці ж не партызан я?

— Вядома, партызан, — было маё слова ў адказ. — Пойдзеш у разведку?

— Гатовы на любое заданне!

І Федзя Клімовіч здзівіць сваімі бясстрашнымі подзвігамі самых бывалых. Ён будзе ўдзельнічаць у кожнай аперацыі, вызначыцца адвагай, кемлівасцю і вынослівасцю, занясе на свой рахунак многа гераічнага і адправіць на той свет не адзін тузін акупантаў. З аднавяскоўцам камсамольцам Іванам Гваздзёвым ён сотні разоў сходзіць у разведку, даставіць «языкоў», разам з ім двойчы па нашым заданні перасячэ лінію фронту і прынясе важныя звесткі ў Беларускі штаб партызанскага руху. І калі ў няроўным баі ён будзе схоплены фашыстамі, якія ў час катаванняў выражуць на яго целе пяцікутную зорку, нічога не скажа карнікам да апошняга імгнення жыцця.

**Пятро Скупаў**. «Паліцай»... Ходзіць па Курыне з павязкай на рукаве, схіліўшы галаву, быццам той бусел, што шукае жабу. Я яго ведаў да вайны як някепскага хлопца. Што ў яго на душы цяпер? Трэба ратаваць... Наш жа ён! Магчыма, шукае бліжэйшыя подступы да нас... Вырашаю: пайду на сувязь з ім сам.

Восенню сорак першага, як звычайна, завітаў да Яўхіма Клімовіча. Мы з ім доўга гутарылі, чыталі савецкія лістоўкі і газету. Калі на зямлю апусціўся густы змрок, я паклікаў Івана Гваздзёва, даю заданне:

— Пакліч Пятра Скупава. Скажы яму: дзядзька Яўхім запрашае. І ні слова пра тое, што тут Райцаў.

Пачуўшы за акном крокі, я стаіўся ў суседнім пакоі. У мяне быў надзейны пісталет. А тым часам гаспадар з госцем пачалі гаворку. Я выбраў зручны момант і нечакана далучыўся да іх.

— А ты, Пеця, мяне не бойся, — кажу Скупаву. — Ведаю, які ты паліцай, хоць і ўсе іхнія даспехі носіш... Здагадваюся, якое ліха цябе загнала ў воўчае логава.

Я не памыліўся: Скупаў усім сэрцам з намі. Пасля нашай з ім гутаркі ён раз-пораз паўтараў:

— Я вораг нашаму агульнаму ворагу — фашыстам. Верце мне. Хоць зараз гатовы пайсці да вас разам з жонкай Варай. І біць, біць, біць гадзін!

— Зараз не трэба, — тлумачу яму. — Заставайся ў паліцыі і служы нам, партызанам. Работы будзеш мець навалам. А калі выдыхнешся, запросім у атрад.



Сустрэча партызанскіх камандзіраў у лесе Шухвасцянскай дачы (1942). Трэці злева — Д.Ф. Райцаў.

Пятро Скупаў і яго жонка — медыцынская сястра Варвара Сокалава — пойдуць адным і партызанскімі сцежкамі-дарожкамі. Увесь іх баявы шлях будзе ўсеяны неўлічонымі подзвігамі ў імя Радзімы. У адным з жорсткіх баёў, апынуўшыся адзін на адзін з вялікай зграяй фашыстаў, яны біліся да апошняга патрона, а ў самы крытычны момант, каб не трапіць у рукі ворага жывымі, узарвалі сябе апошняй гранатай...

* * *

Людзі, якія ішлі да нас, не былі падобныя адно на адно. (Мусіць, калі б сабраць усе мільярды чалавек нашай планеты, то ў кожным з іх прыкмеціш сваё, непаўторнае.) Аднак тых, хто накіроўваўся да нас, у партызаны, пры ўсім такім непадабенстве аб'ядноўвала адна рыса — патрыятызм. І ўсіх іх пад канец «партызанкі» было 2500.

Падрыхтавала **Таццяна КУЗЬМІЧ**.

*г. Віцебск.*

# ПРА ВАЙНУ — ПРАЗ СЯМЕЙНЫЯ РЭЛІКВІІ

## «1941 год. Пачатак» — так называецца выстаўка, якая адкрылася ў Дзяржаўным музеі ваеннай гісторыі Беларусі

**Выстава — толькі першы этап праекта «Мы перамаглі», прысвечанага ўдзелу беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне і разгроме фашызму. Неўзабаве наведвальнікі змогуць пабачыць экспазіцыі яшчэ дзвюх выставак — «Вызваленне Беларусі. Аперацыя «Баграціён» і «1945 год. Мы перамаглі».**

— Асаблівасцю праекта з'яўляецца яго народны характар, — расказаў **дырэктар Дзяржаўнага музея ваеннай гісторыі Сяргей АЗАРОНАК**. — Мы наўмысна не выкарыстоўваем у экспазіцыі фондавыя калекцыі музея. Музейныя прадметы, экспанаты прыносяць да нас ветэраны, дзеці, унукі і праўнукі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Такім чынам людзі становяцца не толькі наведвальнікамі, але і актыўнымі ўдзельнікамі стварэння экспазіцыі.

Аляксандр Слабада, які ў першыя дні вайны абараняў Магілёў на Буйніцкім полі, перадаў музею самую каштоўную сваю рэліквію — пінжак з баявымі ўзнагародамі. Праўда, самую дарагую — зорку Героя Сацыялістычнай Працы — вырашыў зберагчы ў сябе. Так бы мовіць, для выхаду ў свет. І сёння на яго святочным пінжаку ззяе медаль «Серп і Молат», – як напамін аб самаадданай працы на карысць Айчыны.

А вось дачка Героя Савецкага Саюза, камісара партызанскай брыгады «Жалязняк» Сцяпана Манковіча Ніна Сычова-Манковіч вырашыла падзяліцца з музеем наручным гадзіннікам свайго бацькі, а таксама ўнікальнымі фотаздымкамі, зробленымі ў партызанскім атрадзе. Сярод экспанатаў — і асабістыя рэчы ўдзельніка Вялікай Айчыннай Сяргея Сардарава, аднаго з арганізатараў сучаснай сістэмы супрацьпаветранай абароны.

Асаблівую цікавасць выклікаюць фотаздымкі, зробленыя ў першыя месяцы вайны. Іх музею перадалі вядомыя калекцыянеры Уладзімір Ліхадзедаў і Уладзімір Пяфціеў.

— Гэтыя фотаздымкі зроблены нямецкімі акупантамі, але ў тым ліку дзякуючы ім мы ведаем, якой была вайна, — падкрэсліў **лаўрэат прэміі Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне» Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ**. — Фотаздымкі першых дзён Вялікай Айчыннай вайны з'яўляюцца ўнікальнымі, бо іх у свеце захавалася мала. А зробленых савецкімі фотакарэспандэнтамі — увогуле адзінкі. На фотаздымках прадстаўлены многія беларускія гарады. Мы бачым, з якім выхваляннем прыйшлі да нас немцы. Напрыклад, на адным з фотаздымкаў адлюстраваны помнік Леніну, якому гітлераўцы паклалі ў руку вядро. Такіх фотаздымкаў, якія датуюцца 1944 годам, няма, бо фашыстам было не да гэтага. Такім чынам, дзякуючы фотаздымкам мы бачым, як развіваліся падзеі на фронце, як мяняліся настроі ваюючых бакоў.



Фота Канстанціна ДРОБАВА.

Вядомаму філакартысту не раз даводзілася чуць, што Мінск у асноўным быў разбураны савецкімі войскамі ў 1944 годзе. І каб захаваць праўду аб вайне, Уладзімір Ліхадзедаў зноў звяртаецца да фотаздымкаў. «Вось здымак гасцініцы «Еўропа», якую быццам бы разбуралі савецкія салдаты, — паказвае фатаграфію калекцыянер. — Гэты здымак зроблены ў 1941 годзе. Дык як жа савецкія войскі маглі разбурыць Мінск? Гэта той прыклад, калі дзякуючы фотаздымкам захоўваецца праўда пра падзеі».

— Выставачны праект «Мы перамаглі» сёння, як ніколі, актуальны і важны, — лічыць **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёр Аляксандр ГУРА**. — Важны асабліва для нашай моладзі, для тых, каму будаваць моцную і квітнеючую краіну. Важны ўсім тым, на чые плечы кладзецца адказнасць за нашу Радзіму, за мірную працу нашага народа пад мірным небам, за стабільную, адзіную, моцную Беларусь. І калі сучаснае пакаленне будзе дакранацца да геразму іх бацькоў, дзядоў і прадзедаў, будзе атаясамліваць сябе з іх подзвігам, гэтае пакаленне і наша краіна, наша Беларусь, — непераможныя.

**Вераніка КАНЮТА.**

*kanyuta@zviazda.by*

■ Мастацтва і побыт

# ЗАТОПЛЕНЫЯ КАРЦІНЫ

## Абыякавасць і дождж папсавалі работы мастакоў

**На гарышчы сталічнага шматпавярхоўніка па праспекце Незалежнасці, дзе знаходзяцца майстэрні беларускіх мастакоў, вільготна і пахне сырасцю. Доўгачаканы капітальны рамонт пайшоў зусім не так, як спадзяваліся. Валянціна Віктараўна, жонка графіка Аляксандра Дзямарына, праводзіць нас у пакойчык у канцы калідора, дзе звычайна працуе яе муж. На сценах велізарныя падцёкі, канапа прамокла наскрозь. Але мэблі, кажа жанчына, не так шкада. Пацярпелі карціны. Валянціна Віктараўна перабірае гравюры і, здаецца, дагэтуль не можа паверыць, што работы сапсаваны. «Як я магу пра гэта расказаць мужу? Тут столькі працы ўкладзена...»**



У такім стане застала раніцай майстэрню мужа Валянціна Віктараўна Дзямарына.

### Вады — па костачкі

Пра будучы капітальны рамонт у доме мастакі чулі даўно. Але канкрэтныя даты да апошняга не называліся. І тут рабочыя тэлефануюць: праз дзень неабходна вызваліць памяшканне — будуць дэманціраваць дах.

— А куды карціны вывезці? Тут іх пад тысячу (пад дахам знаходзяцца майстэрні пяці мастакоў. — **Н.Л.**)! Дый часу на гэта патрэбна больш. Мы ж людзі пажылыя — паспрабуй пацягай карціны з гарышча, у доме ж ліфта няма, — кажа мастак Пётр Паршын.

На просьбу адкласці рамонт даху хаця б на пару дзён, каб мастакі паспелі вывезці карціны, не адгукнуліся. Маўляў, тэрміны падціскаюць. Паставілі перад фактам: у сераду ў 9.00 пачнём здымаць дах. Першай на чарзе аказалася майстэрня Дзямарына. Жонка і ўнучка мастака за дзень усё ж такі змаглі вынесці з пакоя большасць карцін. Частка работ засталася пры сцяне: іх спадзяваліся прыбраць раніцай, з 7 да 9 гадзін якраз павінны былі паспець. Але аказалася позна. Дах адкрылі яшчэ ў аўторак увечары і, відаць, так і пакінулі, нацягнуўшы наспех плёнку. Тое, што гідраметэацэнтр абяцаў уночы дажджы, праігнаравалі.

— Вады раніцай было па костачкі. Пагляздзіце на тапачкі — яны зусім прамоклі, — Валянціна Віктараўна паказвае нам высокія вязаныя тэпці, якія яшчэ не паспелі высахнуць. — Карціны затапіла. Іх хутчэй сталі пераносіць у майстэрню да Кастуся Качана, лістамі перакладаць, каб хоць неяк захаваць.

Валянціна Віктараўна акуратна перабірае пашкоджаныя работы. На многіх гравюрах і графічных лістах засталіся жоўтыя падцёкі. Такія на выстаўку не павязеш, уздыхае жанчына.

### Праект не ўзгаднілі?

Рамонт у старэнькім шматпавярхоўніку сапраўды патрэбен. І мастакі толькі «за», каб гарышча і дах паднавілі. Пагляздзіце, паказваюць нам, у майстэрні Кастуся Качана столь зусім прадзіравілася: у адным месцы ўжо прасвечвае драўляны насціл. Дах у тым месцы, дарэчы, стаў працякаць яшчэ ў сакавіку, і вада пашкодзіла некаторыя работы.

Але сам праект выклікае ў творчых работнікаў шмат пытанняў. У той жа майстэрні Качана цяпер ёсць акенца ў столі — важная для мастака крыніца святла. Новым праектам акно не прадугледжана.

— Вядома, працей яго «зацыраваць», чым разабрацца ў сітуацыі, — абураецца Жанна, жонка мастака.

Майстэрні пад гэтым дахам стаяць яшчэ з 60-х гадоў. Жыллёвая служба і нанятая імі для рамонту фірма не маглі пра гэта не ведаць. Але праект з Саюзам мастакоў не ўзгаднілі.

Не разумеюць людзі і тое, чаму капітальны рамонт закране толькі дах.

— Вокны ўжо згнілі. Мы іх нават не адчыняем, баімся, што разваляцца і ўпадуць каму-небудзь з мінакоў на галаву, — дзеліцца праблемамі Пётр Паршын.

Пётр Канстанцінавіч цяпер, як і астатнія мастакі, спрабуе тэрмінова эвакуіраваць свае карціны. Ужо адправіў дадому некалькі машын з работамі. Але куды там! У кватэры ўсяго не змесціш, а іншага памяшкання на час рамонту мастакам не прадастаўляюць. Пераносіць карціны ў суседнія майстэрні, дах над якімі будуць дэманціраваць пазней (а менавіта так мастакі і думалі спачатку рабіць, бо гэта самы зручны варыянт), ужо не рызыкуюць.



Пашкоджаная карціна.

### «Мастакі былі апавешчаны»

У ЖРЭА Ленінскага раёна Мінска іншая версія падзей. **Начальнік аддзела капітальнага рамонту Ларыса СЁМЧЫК** запэўнівае, што мастакоў пра будучы рамонт і неабходнасць вызваліць памяшканні папярэджвалі яшчэ са студзеня:

— Людзі былі апавешчаны. Мы некалькі разоў сустракаліся з імі. У нас і лісты афіцыйныя ёсць, і адказы ад мастакоў.

Дах рабочыя цалкам не здымалі, тлумачыць прадстаўніца ЖРЭА.

— Ускрылі маленькі ўчастак, каб паглядзець сітуацыю. Трэба было ацаніць стан кроквенный сістэмы і бэлек. Потым прыкрылі гэта месца поліэтыленам. А ўночы дождж пайшоў. Напэўна, дзесьці дзірка ў плёнцы была, таму працякло, — у жыллёвай службе, відаць, не чакалі, што ўсё скончыцца так сумна.

**— Ці нельга было крыху пачакаць, пакуль людзі вынесуць карціны, перакананца, што ў памяшканні нічога каштоўнага няма?**

— Ведаеце, мы не можам пастаянна падладжвацца пад мастакоў і зацягваць гэты рамонт на год. Гэта ж будынак у цэнтры горада, яго неабходна прывесці ў належны стан.

Што да праекта капрамонту, то ў ЖРЭА катэгарычныя: нідзе не прапісана, што яны абавязаны ўзгадняць яго з творчым саюзам. «А акно тое, якое просяць пакінуць мастакі, зрабілі незаконна. Першапачаткова яго ў старым праекце не было. І ў новым не прадугледжана: акно перашкаджае змантаваць канструкцыю», — пракаментавала Ларыса Сёмчык.

Мастакі не разумеюць: няўжо нельга было падысці да сітуацыі індывідуальна? Гэта ж не пустое гарышча, а майстэрні, якія месцяцца пад дахам дзесяцігоддзямі. І ў іх — дарагія, ва ўсіх сэнсах, для мастакоў карціны.

— А рабочыя: «Ну, што вашы паперкі, падумаеш». Яны не разумеюць, што гэта мастацтва, — бядуе Валянціна Віктараўна. — Гравюру вельмі складана рабіць. Муж доўга ідэю выношвае, з натуры эскіз пісаў, на камені гэты рысунак выразаў — і толькі потым пераносіў на паперу. А хто гэта цяпер кампенсуе?.. Ды і не ўсё грашыма мераецца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
**Фота Канстанціна ДРОБАВА**

■ Неасабісты суб'ектыў



# СОНЦА НА ДАЛОНІ

## Дзеля чаго мы ездзім "галопам па еўропах"?

У КУРОРТНЫХ фатографаў гэта ўжо даўняя "фішка" — зняць героя фота ў антуражы старажытнай архітэктуры або маляўнічага пейзажу ў такім ракурсе, нібыта ён трымае на далоні нейкі вядомы будынак ці прыродны аб'ект. Сакрэт гэты ведаюць цяпер амаль усе ўладальнікі мабільных камер, таму падобных карцінак і ў сямейных фотаальбомах, і на старонках у сацыяльных сетках — безліч. Я, напрыклад, магу пахваліцца, што "трымала на руцэ" фасад антычнай бібліятэкі ў старажытным Эфесе, знакаміты Кёльнскі сабор і нават рымскі Калізей.

Толькі, ведаеце, хваліцца асабліва не хочацца. Ёсць ва ўсіх гэтых радасных фота штосьці... няшчырае, ці што? Трапіў у чужую краіну, у чужую культуру, не паспеў яе нават на каліва спазнаць, а ўжо рукамі (няхай сабе і фігуральна) хапаеш. І што карыснага для розуму, для душы застаецца з тых павярхоўных паездак ("Уся Еўропа за сем дзён!" — як не купіцца на такую заманлівую аб'яву?), акрамя вось гэтых пастановачных картачак, зробленых выключна па прынцыпе "І я тут быў"?..

